Праект аховы пушчы ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Вандроўка ў мінулае... ☞ 5

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 22 (2872) Год LVI | Беласток, 29 мая 2011 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 5%)

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

У абароне сваіх правоў

У магістраце ў Гайнаўцы паслы меншаснай камісіі спаткаліся з прадстаўнікамі нацыянальных меншасцей, пражываючых у Падляшскім ваяводстве

Прадстаўнікі нацыянальных меншасцей на сустрэчы з парламентарыямі сеймавай Камісіі нацыянальных і этнічных меншасцей, якая адбылася 19 мая ў Гайнаўцы, звярталі ўвагу на свае праблемы і незаконныя дзеянні самаўрадаў і дзяржаўных структур у адносінах да нацыянальных меншасцей. Двухдзённая пабыўка камісіі на Беласточчыне была названа інспекцыяй. Паслы пабывалі ў Крушынянах і Беластоку, наведалі Супрасльскі манастыр, а ў Гайнаўцы пабывалі ў Свята-Троіцкім саборы, Музеі і асяродку беларускай культуры і Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы.

У гайнаўскім магістраце першым з прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей выступіў старшыня Беларускага саюза ў РП Яўген Вапа, які звярнуў увагу на малую верагоднасць сёлетняга перапісу насельніцтва. Выдатная большасць людзей у час перапісу не маюць магчымасці адказаць на пытанні ў пашыраным варыянце, а толькі там знаходзіцца пытанне пра веравызнанне. З-за метадалогіі лічэння складана будзе таксама вызначыць колькасць нацыянальных меншасцей.

— Жыхары Храбалоў і Райска не мелі права першакупу прыватызаванай былой пэгеэраўскай зямлі і ёсць падазрэнне, што ў працэсе куплі гэтай зямлі былі сфальшаваны дакументы, — гаварыў Яўген Вапа і прапанаваў спаткацца ды разгледзець справу продажу зямлі, якая ў мінулым належала да беларусаў са згаданых вёсак. Прапанаваў ён сеймавай камісіі таксама прааналізаваць змену выбарчых акругаў для самаўрадавых выбараў у Падляшскі сеймік, якая дзесяць гадоў таму вельмі моцна ўскладніла магчымасць выбраць на ваяводскіх радных прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей ад самастойных меншасных выбарчых камітэтаў.

Прадстаўнік ромаў Станіслаў Станкевіч заклікаў прыняць адпаведную сеймавую пастанову ў справе мартыралогіі ромаў у час Другой сусветнай вайны. Прасіў ён дапамагчы мнагалікім ромскім сем'ям у Гайнаўцы большым жыллём.

Марыя Рыжык і Андрэй Артэмюк з Саюза ўкраінцаў Падляшша прасілі дапамагчы ў справе стварэння трох самастойных аддзелаў з дадатковым навучаннем украінскай мовы ў Бельску.

Дырэктар Музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы Тамаш Ціханюк прасіў пабольшыць датацыю з дзяржаўнага бюджэту на музейныя штаты і ўтрыманне будынка. Зараз на гэтыя мэты з МУСіА выдзяляецца музею каля 50 тысяч злотых, калі на ўтрыманне музея выдаткоўваецца 300-350 тысяч злотых у год.

Галіна Раманчук, прадстаўніца расійскай меншасці, прасіла дапамагчы атрымаць пастаяннае памяшканне для дзейнасці расіян у Беластоку і дадатковы тэлеэфір на расійскай мове ў рэгіянальным тэлебачанні ў Беластоку.

Ад некалькіх прадстаўнікоў меншасцей выйшла просьба памяняць прынцыпы карыстання еўрасаюзнымі сродкамі ў час рэалізавання праектаў меншаснымі арганізацыямі, якія не ў змозе сабраць большых фінансавых сродкаў, каб забяспечыць свой уласны ўклад у рэалізаваныя праекты. Прасілі таксама стварыць магчымасць большага фінансавання іх дзейнасці сродкамі на штаты і ўтрыманне памяшканняў, у якіх знаходзяцца офісы або вядзецца інструктарская работа.

Старшыня Камісіі нацыянальных і этнічных меншасцей Марк Аст паведаміў, што 26 мая камісія падвядзе вынікі інспекцыі па Падляшскім ваяводстве і тады будуць разглядацца ўсе заўвагі з гайнаўскай сустрэчы. Падляшскі ваявода Мацей Жыўна сказаў толькі, што ў 18 скіх вёсак і прыгожа памаляваных цэркваў. Усе меншасці ў Польшчы церпяць бяду, а ўзровень польскай дэмакратыі мерыцца адносінамі дзяржавы да нацыянальных меншасцей, іх адукацыі і культуры. Трэба змагацца за гэты ўзровень дэмакратыі, — гаварыў сілезец, віцэ-старшыня камісіі Казімеж Куц.

У абарону польскай дзяржавы выступіў старшыня камісіі Марк Аст, патлумачыўшы недахоп сродкаў на фінансаванне дзейнасці нацыянальных меншасцей беднасцю дзяржавы.

— Мы павінны змагацца, каб закон аб нацыянальных меншасцях не быў мёртвым і каб дзяржаўныя і самаўрадавыя структуры прытрымліваліся яго. У кампетэнцыі сеймавай камісіі дапамагаць нам у балючых нам справах, — сказаў старшыня Беларускага саюза ў РП Яўген Вапа. — За нашы справы павінны змагацца таксама нашыя масмедыі. Зараз гаворыцца аб дыскрымінацыі палякаў у Літве, а нам трэба змагацца, каб у польскай адукацыйнай сістэме было вывучанне гісторыі Беларусі і беларускай літаратуры.

У Гайнаўскім белліцэі перад пасламі выступілі вучні. Дырэктар Яўген Сачко паказаў госцям школу, а настаўнік беларускай мовы Ян Карчэўскі расказаў пра поспехі вучняў у алімпіядах і конкурсах. Метадыст па беларускай мове Іаромаў у час Другой сусветнай вайны.

У Гайнаўскім белліцэі парламентарыі спаткаліся з дырэктарам Яўгенам Сачко (злева дырэктар і старшыня камісіі Марк Аст) і настаўнікамі беларускай мовы

У Беларускім музеі члены меншаснай камісіі найбольш зацікавіліся экспазіцыямі з даўнімі прыладамі працы

гмінах на Падляшшы, дзе больш кампактна пражываюць нацыянальныя меншасці, спісвацца будзе 100% насельніцтва, а памяшканні для меншасных арганізацый будуць маглі быць выдзелены ў будаваным зараз Цэнтры супрацоўніцтва няўрадавых арганізацый у Беластоку. Пасол Яўген Чыквін паведаміў, што справа куплі зямлі ў Храбалах і Райску будзе разглядацца на супольным пасяджэнні Камісіі нацыянальных і этнічных меншасцей і Камісіі тэрытарыяльнага падзелу.

— Мяне ўразіла арыгінальнасць і непаўторнасць Падляшша, выгляд беларуланта Грыгарук паведаміла пра клопаты з падручнікамі. Выдавецтвы, якія раней выдавалі падручнікі па беларускай мове, не рашыліся перавыдаць іх з-за складанай працэдуры рэфінансавання Міністэрствам адукацыі.

— Я не ведаў, што ёсць такія складанасці. Давайце спаткаемся і супольна абмяркуем справу новых падручнікаў, а да гэтага часу я пастараюся ў Міністэрстве адукацыі высветліць праблему, — сказаў настаўнікам пасол Яўген Чыкін. — Думаю, што не будзе праблем перавыдаць падручнікі, якія раней выдавала выдавецтва „Ортдрук".

9 770546 196000

Плата ды расплата

Усе ведаюць, што за ўсё трэба плаціць. І расійскі прэм'ер Пуцін, які нядаўна наведаў Беларусь, даў ясна гэта зразумець беларускаму кіраўніцтву. Ён прыехаў нібыта па бягучых справах постсавецкай прасторы, якая зараз мае безліч фармаванняў, ад СНД да мытнага саюза. А чакалі расійскага прэм'ера не менш, чым бедныя сваякі, якія чакаюць багатага дзядзьку. Ды і не дзіва. У дзядзькі грошы ёсць. Ёсць нафта, газ, золата... Зрэшты, золата, калі верыць афіцыйным заявам, і ў саміх хапае. Золатавалютны запас краіны як быццам бы яшчэ амаль што некрануты. Толькі яго на падтрыманне рубля пускаць, з пункту гледжання сённяшняй улады, недапушчальнае марнатраўства.

Цікава, навошта тады ён увогуле патрэбны, калі яго нікуды не пускаюць. Золата, само па сабе, для жыцця чалавека прадукт не надта абавязковы. Яго не з'ясі, не вып'еш, а калі і апранеш, то яно не асабліва грэе. Хіба толькі душу. Ці калі больш дакладна, то грэе не ўсю душу, а толькі такія яе якасці як самазадавальненне ды ганарлівасць. Ды і то не ўсім.

Для эканомікі, калі верыць школьнай праграме, золата таксама рэч не найперш патрэбная. Яшчэ Аляксандр Пушкін, якога ў беларускіх школах прымушаюць завучваць нават двоечнікаў, у „Яўгенію Анегіне", захапляючыся сваім героем, пісаў: „То есть умел судить о том/ Как государство богатеет/ И чем живет, и почему/ Не нужно золота ему/ Когда простой продукт имеет".

Вось хіба ўся справа ў тым „простым прадукце". (Шкада, што не ўсе ў школе паэзіяй захапляліся.) Тры мільярды Пуцін паабяцаў. Нават не з расійскага бюджэту, а з кішэні ЕўрАзЭСу. Гэта яшчэ адно постсавецкае фармаванне. Нібыта агульнае, але ўсім зразумела, хто там галоўны. Галоўны вырашыў грошы ўзяць, і даць. Але што захацеў узамен? Вось дзе пытанне! Раней, калі яшчэ быў прэзідэнтам, хацеў усю Беларусь, цалкам або па частках. Зараз хіба, хоча менавіта „просты прадукт" у выглядзе „МАЗа", „Белтрансгаза", ды яшчэ якога-небудзь „-аза". А пасля, як зноў стане прэзідэнтам, зможа вярнуцца да ранейшых прапаноў.

Беларускі ўрад атрыманне крэдыту падае як найвялікшае дасягненне не толькі айчыннай дыпламатыі, але і эканомікі. Ці калі дакладней, то айчыннай эканамічнай мадэлі. Яна падаецца як найлепшая, толькі мае адзін дробненькі недахоп — гэтая мадэль увесь час патрабуе фінансавых уліванняў звонку. Таму і паўстае пытанне прыватызацыі, якая патрэбна ў такіх умовах хіба што толькі Расіі. І толькі расійскія алігархічныя колы атрымаюць ад гэтага прыбытак. А без выканання расійскіх умоў, трохмільярдны транш можа спыніцца ў кожную хвіліну. Таму найлепшая эканамічная мадэль будзе прымаць усялякія ўмовы. Што зробіш, трэба грошы.

Праўда, грошы можна ўзяць не толькі на ўсходзе. Захад таксама гатовы даваць, і даваў. І калі верыць выказванням высокапастаўленых беларускіх чыноўнікаў, то рабіў гэта яшчэ больш выгадна, чым Расія. Мала таго, Еўрасаюз задарма падключае праверaных у фінансавых справах спецыялістаў, і дае парады пра тое, што трэба выправіць у найлепшай эканамічнай мадэлі, каб яна стала проста харошай і магла функцыянаваць без сістэматычных пазык. Здавалася б, чаго больш трэба. Бяры, і карыстайся.

На жаль, гэта стала немажлівым з тае банальнай прычыны, што Еўрасаюз умовы ставіць зусім не такія, як усходняя суседка. Захаду не трэба нашай краіны ні часткамі, ні цалкам. Яму трэба, каб у краіне не было палітвязняў. Для пачатку. Ну і пасля пара-тройка патрабаванняў. Збольшага, пра правы чалавека. Цікава, ад чаго хутчэй сённяшняя ўлада адмовіцца, ад маёмасці, ці ад „ідэалогіі"?! Бо „судны дзень" у Беларусі цягнецца ўжо амаль што паўгода і зрабіў толькі адзін невялічкі перапынак. Па афіцыйнай версіі з-за хваробы суддзі. Скарыстаўшыся гэтым перапынкам, кіраўнік расійскага МЗС Лаўроў вельмі дыпламатычна патлумачыў заходнім калегам, чаму Расія, якая нібыта таксама заклапочаная станам дэмакратыі ў Беларусі, мусіць даць гэтыя тры мільярды. Такім чынам, усе фармальнасці выкананыя. Можа праз нейкі час у абменніках нават з'явіцца валюта. Толькі вось чым прыйдзецца за гэта расплаціцца, пакажа час.

Віктар САЗОНАЎ

Горш калі лепш

Як блізарукае дзіця мусіў я ад першых класаў пачатковай школы насіць акуляры. Найгоршы быў той першы раз, калі паказаўся я ў іх перад суцэльным фонам маіх добра бачыўшых аднагодкаў. „Акулярнік! Акулярнік!" — закрычалі яны хорам. І так пачуў я першы раз смак горычы няслушнага вылучэння і затым адзіноты ў тлуме. Здаецца, было гэта найбольш траўматычнае перажыванне ў маім дзяцінстве. Толькі з часам акуляры сталі для мяне чымсьці так натуральным, як мае шматлікія, юнацкія комплексы, напрыклад вялікі нос і малыя адтапыраныя вушкі. У палове сямідзесятых гадоў кудысьці закінуў я акуляркі ў стылі Джона Ленана, модныя ў той час ды шыкоўныя, з цьмяным шклом. Вось адкрыў я ў бабуліным шкапчыку старыя, эбанітавыя апраўкі, маленькія, круглыя, з прамянём мала меншым за маю вачніцу, якія выжабраваў у яе не без вялікіх просьбаў, а нават хітрых абяцанняў. Гэтыя акуляркі насіў я з юнацкім какецтвам, ды таксама не без кампенсуючай падаплёкі, якая ставіла мае барочныя комплексы ў бравай апазіцыі да вонкавага свету. Былі яны кур'ёзныя па форме і з-за гэтага накладвалі на мяне блазенскую ганебнасць парафіяльнага франтаўства. Дарэчы, выглядаў я ў іх як малпа, што ўдае зусім адурэлую саву; ды хай там! Насіўся я тады па-мужыцку, у кажусе па маёй прабабулі Анелі — крыху зацесным — з парцяной торбай праз плячо і прышпіленым да яе паяска вялікім, ідыятычна падскокваючым у рытм крокам гадзіннікам маркі „Рухля". Чаму — да сёння не ведаю. Так вось аўчына прабабулі Анелі, бабуліны акуляркі і той безгустоўны гадзіннік гедэйраўскага роду вельмі не складваліся адно з адным, што больш, у сваёй прэтэнцыёзнай купе былі зусім блазнаватыя. Паводле дарослых, выглядаў я як блазнюк і сапраўды быў я ім. Ды я быў блазнам, кантэстуючым заспелы свет і ставячым яго на галаве. Незалежна ад таго бабуліны акуляркі не страцілі нічагуткі са сваёй дурацкай атракцыйнасці. Трэба было толькі адчакаць крыху часу. Бо ўжо пасля ліцэя я пачуў ад калег, што на іх думку былі яны бачным знакам майго пакаленнявага супраціву крывадушнасці свету дарослых і сацрэалістычнай неахайнасці народа. Дурнота! Мяне па-просту прыцягвала іхняя арыгінальная брыдота; апрача таго, носячы іх, парадаксальна я ўсведамляў сябе больш цікавым, нават інтрыгуючым; ха-ха! Пражываючы ўжо ў Варшаве, можа дэкаду пасля, надалей у гэтых самых акулярках, падслухаў я ў трамваі размову двух юнакоў: „Глянь, якія ольдскулевыя акуляркі мае гэты дзядзька. Цікава, дзе такія можна купіць?". Неўзабаве шмат маладых, гнеўных людзей, кантэстуючых усё і ўсіх, пачало падобныя апраўкі абношваць на сваіх кірпатых насах. Быў гэта адпаведны момант, каб свае бабуліны акуляркі схаваць у глыбокую шуфляду. Так я і зрабіў. Ды захаваў я іх для будучых пакаленняў.

Ды чаму так дэталёва апісваю гісторыю гэтых акуляраў? Вось у час, калі я іх насіў, часта чуў ад дарослых, што „іграю на носе" свету або стаўлю ўсё на галаве. З прыкрасцю прызнаюся, што, глядзеўшы на сённяшнюю моладзь, такія словы самі ціснуцца мне на вусны. Свет зноў стаў на галаве. Ды гэта добра!

Шмат дзіўнага гаворыцца пра маладых людзей. А то яны паглыбленыя толькі ў свае справы, бо вось адрываюцца яны ад рэальнага свету, уцякаюць у той віртуальны, генераваны камп'ютарамі ці інтэрнэтам. На фоне досведу майго пакалення — так ёсць сапраўды. Свет становіцца штораз дзіўнейшым, горшым... Ды добра, што яно так і ёсць.

Перакананне, што свет становіцца горшым і наступае дэгенерацыя людства, паўсюднае і выказвае яго кожнае чарговае пакаленне. Нараканні на гэтую тэму чуем сёння, ды чулі іх усе папярэднія генерацыі. Плутарх прыпісвае вось такое выказванне Агісу, сыну Архідама: „Калі свет паводле адыходзячага пакалення становіцца на галаве, значыць — справы пойдуць нармальна. Калі я быў дзіцём, чуў ад бацькі, што ў яго час усё было перавернута дагары нагамі. Расказваў ён таксама, што яму як дзіцяці тое самае казаў яго бацька. Таму не трэба здзіўляцца, калі справы, якія наступяць пасля, будуць горшымі ад ранейшых, хутчэй тыя, што наступяць пасля, у нечым будуць лепшымі ад гэтых, што раней былі, або хоць да іх падобныя!".

Міраслаў ГРЫКА

Вачыма еўрапейца

Беларускае відэамастацтва

Быў я нядаўна пад уражаннем аповедаў мастачкі і куратаркі выстаў з Брэста Вольгі Маслоўскай, якая ва ўніверсітэце ў Беластоку ў рамках чарговага ўжо Падляшскага фестывалю навукі і мастацтва расказвала пра беларускае відэамастацтва. Сустрэча адбылася дзякуючы навуковым супрацоўніцам Кафедры беларускай культуры д-р Лене Глагоўскай і д-р Гражыне Харытанюк-Міхей. Гераіня сустрэчы вядомая ў свеце м.інш. тым, што разам з іншым творцам — Раманам Трацюком належыць да ўзніклай у 1989 г. групы „Бергамот", якая займаецца мастацтам перформенсу, відэа і фатаграфіі. Шчыра сказаўшы, няшмат ведаў я пра беларускае відэамастацтва, якое вывучаецца ўжо нават у акадэміях мастацтваў; у Варшаве адпаведны факультэт узначальвае праф. Лявон Тарасэвіч. Ды не ў Беларусі.

— Відэамастацтва ў Беларусі гэта эфемерная з'ява. Увогуле ў Беларусі няма ўстановы, якая займалася б сучасным мастацтвам. Самі мастакі займаюцца ім і яго распаўсюдам. Існуе яно як андэграўнд або ўзнікае за мяжой, — гаварыла ў час сустрэчы Вольга Маслоўская.

Цяжка з ёю не пагадзіцца, што генеральна мастацтва ў Беларусі, як гэта адбываецца ў таталітарных краінах, выконвае аздобную функцыю і часта з'яўляецца прыладай, якая служыць ідэалагічнай маніпуляцыі. З даклада мастачкі з Брэста вынікала, што разам з абмежаваннямі дэмакратыі пасля таго як прыйшоў да ўлады Аляксандр Лукашэнка, пачалі ў Беларусі знікаць галерэі сучаснага мастацтва, а аўтары г.зв. перформенсаў ці якраз відэамастацтва на практыцы зніклі з публічнай мастацкай прасторы гэтай краіны.

— Відэамастацтва ў Беларусі таксама неразвітае, бо патрабуе адпаведнай тэхналогіі і гледачоў з вытанчаным густам. Перформенс больш развіты, бо не патрабуе такіх тэхналогій. Часта дастаткова аднаго мастака.

Прытым сяброўка „Бергамота" адзначыла:

— Важна, каб беларускія мастакі ўдзельнічалі ў міжнародных мерапрыемствах, як і на сёлетнім біенале ў Венецыі [і ў час працягваючайся цяпер калектыўнай выставы больш за дзесяці мастакоў „Адчыняючы дзверы? Беларускае мастацтва сёння" ў варшаўскай галерэі „Захэнта" — М. Х.].

Сустрэча ў беластоцкім універсітэце была рэдкай нагодай для таго, каб пабачыць некалькі прац відэа беларускіх творцаў (раней, здаецца, гады два таму, некаторыя такія працы паказваліся ў галерэі „Арсенал"). Аб — як сказала Вольга Маслоўская — разагнанні асобы ў імклівым свеце і штучным асяроддзі расказваў фільм „Opus opera" Максіма Тыменкі (жыве ў Дзюсельдорфе). Аляксандр Камароў (Амстэрдам) у фільме „Празрыстасць" склаў у кадрах мадэрныя шкляна-сталёвыя канструкцыі галандскай фабрыкі Ван Галле з будынкам груваcткога берлінскага Бундэстага. Іншы з аўтараў у фільме „Сёмае неба" абмежаваўся да працягваючагася ў „бязмежнасць" акту арс-амандзі мужчыны з жанчынай з рэгулярна развіваючымі і звіваючымі анёльскімі крыламі. Яшчэ іншы ў адыгранай перадачы тэледыктараў гаварыў аб сітуацыі беларускіх гомасексуалістаў.

Усе паказаныя працы, несумненна, упісваюцца ў сучасную плынь сусветнага мадэрнага мастацтва, як няміла бачаная ў Беларусі дэмакратыя. Я дзякую, што мог у гэтым пераканацца. Як заўважыў я ў час паказаў, пад іх уражаннем быў нават немалады паэт Віктар Швед. Пры нагодзе: Вольга Маслоўская намаўляла ў час сустрэчы высылаць мастацкай групе „Бергамот" сцэнарыі перформенсаў. Можна гэта зрабіць на сайце www.bergamot.in.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Новы праект аховы Белавежскай пушчы

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Калі грамадзянскі законапраект аб змене пастановы аб ахове прыроды, які разглядаецца ў Сейме, можна прыраўняць да бізуна, якім можна было б самаўрады Гайнаўскага павета пазбавіць рэальнага голасу ў справе пашырэння Белавежскага нацыянальнага парку, то апошнім часам паявіўся таксама і пернік, які ў будучыні можа захвоціць мясцовае грамадства больш прыхільна глянуць на справу пашырэння паркавых тэрыторый. Новая прапанова гэта праект праграмы „Ураўнаважанае развіццё рэгіёна Белавежскай пушчы" (аб якой у агульным мы ўжо пісалі). Аднак яе ініцыятары, пасол ад Грамадзянскай платформы Роберт Тышкевіч і незалежны сенатар Владзімеж Цімашэвіч, рашуча заяўляюць, што ажыццяўленне новага праекта не ўскладвае на мясцовае грамадства ніякіх новых абавязацельстваў у справе аховы Белавежскай пушчы, а тым болей наконт павелічэння паркавых тэрыторый, затое стварае вялікія магчымасці рэальнага эканамічнага развіцця рэгіёна пушчы і будовы новай інфраструктуры, якая мела б павысіць стандарт жыцця насельніцтва і аховы Белавежскай пушчы.

У час прэс-канферэнцыі. Справа: пасол Роберт Тышкевіч, міністр Альжбета Бянькоўская і сенатар Владзімеж Цімашэвіч

— Ствараючы нашую праграму мы рашылі, што самае важнае ўраўнаважанае развіццё рэгіёна, а гэта абазначае, што трэба адначасна дбаць аб людзях і прыродзе, — заявіў 13 мая ў Белавежы пасол Роберт Тышкевіч у час прэс-канферэнцыі з удзелам міністра рэгіянальнага развіцця Альжбеты Бянькоўскай і сенатара Владзімежа Цімашэвіча. Канферэнцыя адбылася пасля сустрэчы згаданых палітыкаў са старастам, войтамі і бурмістрамі Гайнаўскага павета, у час якой самаўрадаўцы ўступна адобрылі прапанову парламентарыяў. Міністр Альжбета Бянькоўская заявіла, што Міністэрства рэгіянальнага развіцця будзе падтрымліваць праект праграмы „Ураўнаважанае развіццё рэгіёна Белавежскай пушчы", але гэта самі самаўрады павінны заняцца падрыхтоўкай праекта. Да канца мая павінна быць вядома, якія сродкі міністэрства прызначыць на падрыхтоўку дакументацыі і іншыя падрыхтоўчыя працэдуры згаданага праекта, які мае быць адным з прыярытэтаў праграмы „Развіццё ўсходняй Польшчы" ў новай перспектыве еўрасаюзнага бюджэту на 2014-2020 гады.

— Мы знаходзімся на адзіным такога роду месцы ў Еўропе і яно павінна быць для ўсяго рэгіёна адметным козырам. Мусім перастаць разглядаць гэты рэгіён як праблемную тэрыторыю, а пачаць глядзець на яе як на тэрыторыю асаблівага зацікаўлення. Дзеля гэтага патрэбныя грошы ды ёсць магчымасць іх атрымаць. Мы хочам давесці да таго, каб людзі хацелі аставацца тут жыць і мелі працу. Новая праграма — адна з першых такіх ініцыятыў, якія тычацца новага еўрасаюзнага бюджэту і мы будзем яе падтрымліваць, — гаварыла міністр Альжбета Бянькоўская. Звярнула яна ўвагу, што рэальныя інвестыцыі могуць паявіцца толькі пасля 2014 года. Паінфармавала таксама, што самаўрадам трэба будзе знайсці ў бліжэйшы час аператара праграмы — установу, якая каардынавала б усе дзеянні вялікага праекта. Пасол Роберт Тышкевіч заявіў, што ў рамках новай праграмы павінны паявіцца вялікія, стратэгічныя для ўсяго Гайнаўскага павета, інвестыцыі і гэта яны павінны папаўняцца меншымі прапановамі.

— Накіроўваючы ў рэгіён Белавежскай пушчы еўрасаюзныя сродкі, мы павінны стварыць таксама клімат для павышання стандартаў аховы Белавежскай пушчы. Партнёрам праграмы могуць быць таксама экалагічныя арганізацыі, — сказаў Роберт Тышкевіч.

Владзімеж Цімашэвіч і гайнаўскі староста Уладзімір Пятрочук гаварылі, што галоўным прынцыпам новага праекта з'яўляюцца пошукі шырокага паразумення.

— Мы хацелі б выйсці з гэтага кола няспынных спрэчак і канфліктаў вакол аховы Белавежскай пушчы. Ведаем, што гэта доўжыцца многа гадоў і не прасунула справы аховы Белавежскай пушчы ні на крок наперад, — заявіў сенатар Цімашэвіч. — Я размаўляў у Бруселі з еўрасаюзным камісарам па пытаннях аховы навакольнага асяроддзя Янезам Паточнікам. Комплекснасць нашай праграмы зрабіла на ім вялікае ўражанне. Сказаў, што гэта супадае з ягоным спосабам думання аб вырашанні грамадскіх і гаспадарчых праблем датычных аховы натуральнага асяроддзя і дэкларавў сваю дапамогу.

— Мы разам з польскім урадам хочам пераканаць Еўрапейскую камісію, каб у праграме „Развіццё ўсходняй Польшчы" на 2014-2020 гады адвяла канкрэтныя грошы толькі для Гайнаўскага павета, — сказаў пасол Роберт Тышкевіч. — Спрэчкі ў справе аховы Белавежскай пушчы можна будзе вырашыць толькі папраўляючы ўмовы жыцця жыхароў навакольных гмін. Белавежская пушча гэта вартаснае дабро ўсёй Еўропы. Як еўрапейскае грамадства мы супольна адказныя за будучыню пушчы.

Прадбачваецца, што ў рамках новага праекта на інвестыцыі ў Гайнаўскім павеце можна будзе атрымаць нават да 70 мільёнаў еўра.

— Новы праект, гэта шуканне кампрамісаў паміж патрэбамі насельніцтва і патрэбамі аховы пушчы. Мы павінны абмеркаваць як паправіць стандарт жыцця нашых жыхароў, бо за 12 гадоў дзейнасці паветаў у Гайнаўскім павеце колькасць насельніцтва скарацілася з 54 тысяч ажно да 48 тысяч, — заявіў гайнаўскі староста Уладзімір Пятрочук. — Белавежская праграма развіцця была адкінута нашымі самаўрадамі і гэтая справа закончаная. Аднак Міністэрства асяроддзя надалей хоча размаўляць з намі ў справах новых прапаноў па ахове пушчы. Не ведаю якія гэта прапановы, але прадбачваю, што могуць яны быць падобнымі да тых з Белавежскай праграмы развіцця. Зараз у нас ёсць таксама магчымасць атрымліваць сродкі з Рэгіянальнай аператыўнай праграмы і ў рамках Платформы супрацоўніцтва для рэгіёна. Новы праект можна было б спалучыць з праектамі, фінансаванымі з нашага дзяржаўнага бюджэту. Мы лічым, што залатоўкі можна было б выкарыстаць у якасці нашага ўкладу, неабходнага для рэалізацыі еўрасаюзных інвестыцый.

— Грошы з новай праграмы могуць трапіць да самаўрадаў і няўрадавых арганізацый, да прадпрымальнікаў і індывідуальных жыхароў Гайнаўскага павета, — сказаў пасол Роберт Тышкевіч. Прадбачваецца, што сродкі з новага праекта былі б выкарыстаны на будову дарог, каналізацыю, газіфікацыю рэгіёна, на інвестыцыі ў галіне ўтылізацыі адходаў ці на выкарыстанне аднаўляльнай энергіі. Прадугледжваецца таксама дапамога для гаспадарчых інвестыцый у галіне турызму і іншых сектараў, а таксама выдаткоўванне сродкаў на разбудову інтэрнэтнай сеткі, навуковую, адукацыйную і прамацыйную дзейнасць, на будову прадшколляў ці рамонты вясковых святліц. Пасол Роберт Тышкевіч лічыць, што самаўрады павінны надалей мець права ўздзеяння на кшталт межаў ахоўваных тэрыторый і выказвае надзею, што канчатковае рашэнне Сейма ў справе грамадзянскага законапраекта аб змене пастановы аб ахове прыроды будзе добрае для самаўрадаў і насельніцтва прыпушчанскай тэрыторыі.

Адна з журналістак пыталася ў час прэс-канферэнцыі, як трэба ахоўваць Белавежскую пушчу, звяртаючы ўвагу на шмат паваленых у пушчы дрэў, якія, між іншым, ляжаць і нішчэюць побач дарогі Гайнаўка — Белавежа і на засохлыя ад караедаў дрэвы.

— У пушчы дрэвы не марнуюцца, — заявіў сенатар Владзімеж Цімашэвіч і дадаў, што калі дарога перасякае пушчу, то краявіды з паваленымі дрэвамі будуць бачны.

Міністр Альжбета Бянькоўская сказала, што павелічэнне тэрыторыі парку неабходнае. Пасол Роберт Тышкевіч таксама не падтрымаў крытыкі цяперашняй аховы Белавежскай пушчы.

Новы праект праграмы „Ураўнаважанае развіццё рэгіёна Белавежскай пушчы" можа стварыць вялікія магчымасці развіцця прыпушчанскага рэгіёна. Аднак зараз цяжка акрэсліць шанцы яго ажыццяўлення ў такім выглядзе і з такой фінансавай падтрымкай, аб якой гаворыцца зараз. Калі б удалося паспяхова давесці гэты праект да рэалізацыі, то канкрэтныя інвестыцыі маглі б паявіцца ў Гайнаўскім павеце найхутчэй за 3-5 гадоў. А Міністэрства асяроддзя ўжо цяпер хоча аднавіць размовы ў справе больш строгай аховы Белавежскай пушчы. Малапраўдападобнае, што новы або толькі абноўлены ўрад схоча так доўга чакаць інвестыцыйных рэзультатаў. Хутчэй за ўсё Міністэрства асяроддзя будзе імкнуцца пераканаць мясцовыя самаўрады да сваіх прапаноў і давесці да пашырэння Белавежскага нацыянальнага парку ўжо ў бліжэйшы час, напрыклад, у наступным годзе, пасля парламенцкіх выбараў. У Гайнаўскім павеце мяркуецца, што вырашальны галасаванні ў справе грамадзянскага законапраекта аб змене пастановы аб ахове прыроды будуць адбывацца ўжо пасля парламенцкіх выбараў і будзе ён адкінуты. Аднак такое думанне даволі спрошчанае. Пасля выбараў праэкалагічнае лобі можа знайсці сярод нававыбраных паслоў больш прыхільнікаў, чым мае зараз, і давесці да пашырэння Белавежскага нацыянальнага парку нават без згоды самаўрадаў.

Небяспечныя сабакі

Спрадвечная праблема ўсім добра вядомая — гміннаму самаўраду, паліцыі ды мясцовай грамадскасці, а тычыцца яна... сабак. Свабодна валэндаючыся чатырохногія пагражаюць не толькі дзецям на вуліцы, але і дарослым. Пераканаўся я ў гэтым асабіста. 1 траўня ехаў я на ровары ў Райкі праз вёску Леўкі. Вуліца здавалася быць апусцелай, вымерлай. Калі пад'язджаў у канец вёскі і павярнуў у Райкі, з загумення (з левага боку) нечакана выскачылі тры агрэсіўныя сабакі. Ледзь ад іх абараніўся. Некалькі дзесяткаў метраў праводзілі мяне, скуголячы. На ўсе бакі азіраўся, каб нейкае сабарно за нагу не схапіла. Хачу адзначыць, што не быў гэта адасоблены выпадак. Такое ж прыкмячаў я за кожным разам, калі ехаў у Райкі. Затым маё пытанне: чаму гаспадар не трымае сабак на прывязі? На маю думку, справай павінен пацікавіцца перш за ўсё мясцовы солтыс, які павінен павучыць несумленнага аднавяскоўца аб правілах абавязваючага закону (трымаць сабак на прывязі), а калі гэта не падзейнічае, справу прад'явіць гміннаму самаўраду або органам правапарадку. **(ус)**

Важная памяць

Напарэдадні Дня перамогі 8 мая г.г. я паехала на веласіпедзе на бельскі могільнік.. Гэты дзень для мяне вельмі важны. Штогод я купляю лампадку і еду на могільнік савецкіх салдат, якія загінулі ў час II сусветнай вайны пры вызваленні Польшчы з рук нямецкіх акупантаў. На магілах у Бельску цвітуць жоўтыя і чырвоныя цюльпаны, а на кожнай магіле гараць аднолькавага колеру лампадкі; дадумваюся, што паклапаціліся аб гэтым улады горада. Падыходжу да галоўнага помніка байцам, бачу ўскладзены вянок з надпісам ад бурмістра Бельска. Запальваю сваю лампадку і схіляю голаў.

Поўдзень, нядзеля. Няма жывой душы ў гэтым месцы, ды і „недзяржаўныя" лампадкі можна палічыць на пальцах адной рукі. Пытаюся ў сябе, чаму так мала жыхароў горада памятае пра тых, хто аддаў сваё жыццё за тое, каб мы маглі жыць свабодна і пад мірным небам? Маглі б хоць праваслаўныя, якіх так многа ў Бельску, памятаць! Памяць пра тых, хто паклаў сваю галаву за свабоду — вядомых і невядомых салдат — павінна быць важнай!

Ці так быць павінна?

У горадзе Бельску ў розных месцах пастаўлены кантэйнеры для збору паношанай вопраткі, куды людзі ўкідваюць адзенне ўжо ім непатрэбнае ды яшчэ ў някепскім стане — хтосьці з патрабуючых можа ў ім яшчэ пахадзіць. Я заўважыла, што па вуліцы Белавежскай каля магазіна ПСС вопратка ляжала ў торбах і без іх на зямлі каля кантэйнера. Было рознае надвор'е, ішоў дождж, і ўсё тое змокла. Апрача таго хтось, хто даставаў тое адзенне, усё паразграбаў. Шкада, бо людзі складваюць тыя рэчы чыстымі і перабранымі. Да таго было гэта пару дзён да Вялікадня і ў свята быў там такі непарадак. Мне здаецца, што адказная ўстанова павінна часцей правяраць тыя кантэйнеры. Хтось стараецца аддаць яшчэ добрыя рэчы не на змарнаванне, а іншыя пра гэта не дбаюць!

Жэня МАРТЫНЮК

ЛЮСТРАЦЫЙНЫ АБМАНШЧЫК? (7)

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

Амаль праз год перад беластоцкім Акруговым судом нанова рушыў чарговы разбор справы падляшскага дэпутата ад СЛД Яўгена Чыквіна. У гэты раз давалі свае паказанні працаўнікі беластоцкага аддзела Інстытута нацыянальнай памяці (ІНП), які абвінавачвае парламентарыя ў люстрацыйным абмане. Іх тлумачэнні датычылі перш за ўсё пытанняў наконт верагоднасці дакументацыі, перададзенай ІНП у акты справы.

Прыгадаем. Працэс пачаўся ў кастрычніку 2009 г. ІНП абвінаваціў дэпутата Чыквіна ў люстрацыйным абмане, паколькі, на думку Інстытута, не прызнаўся ён да супрацоўніцтва са Службай бяспекі ў якасці сакрэтнага супрацоўніка (сексота) у васьмідзесятыя гады, калі актыўна дзейнічаў у беластоцкім аддзеле Хрысціянскага грамадскага згуртавання (ХГЗ). СБ мела быццам бы назваць яго псеўданімамі „Вільгельм" і „Ізыдар", а цікавілася ім ужо ў другой палове сямідзесятых гадоў. Сам дэпутат неаднойчы тлумачыўся і перад судом, і перад журналістамі, што з-за сваёй дзейнасці ў ХГЗ прымушаны быў да нейкай формы кантактаў з функцыянерамі спецслужбаў. Пярэчыць, аднак, таму, што сакрэтна і свядома з імі супрацоўнічаў. Прыгадвае таксама тое, што гадамі раней заступнік публічнага інтарэсу прызнаў яму рацыю і палічыў невінаватым.

У гэты раз перад судом давалі свае паказанні два сведкі — працаўнікі ІНП: Анна П., былая працаўніца беластоцкага аддзела ІНП, якая займалася аналізам дакументацыі і Войцех Ф., кіраўнік тутэйшага рэферата ўліку. Анна П. на пачатку паказанняў тлумачыла:

— Я памагала ІНП весці справу: збірала архіўныя матэрыялы ў рамках люстрацыйных разбораў.

Распытваная ўпаўнаважаным дэпутата Чыквіна адвакатам Кшыштафам Чашэйка-Сахацкім, адзначыла:

— Павінны застацца ў архівах дзве папкі пана Чыквіна: працы і персанальная. У гэтай справе, аднак, збор дакументаў быў змешчаны ў адной папцы. Матэрыялы былі знішчаныя перад 1990 годам, а павінны быць перададзены ва Установу аховы дзяржавы (УАД), пасля — у Агенцтва ўнутранай бяспекі і на канец у ІНП. Я не ведаю, хто бракаваў матэрыялы. Калі гэта адбывалася да 1990 г., рабіла гэта СБ.

Дадала:

— З інвентарнага спіска актаў вынікае, што частка дакументаў была знішчана. Павінны застацца папкі персанальная і працы. Не ведаю, хто склаў гэты збор дакументаў.

Пасля паказання гэтай папкі (збору дакументаў) старшынёй судзейскага складу Бэатай Аліферук, сведка прызналася:

— Гэтая папка напэўна не адкрывалася ў ІНП. У такой форме дайшла яна ў ІНП. Мабыць, была створана або ў УАД, або яшчэ ў СБ.

На канец вярнулася да першай заявы:

— Не ведаю, хто спалучаў матэрыялы ў рамках адной папкі. Не памятаю, з якіх дакументаў, не ведаю ці існавалі папкі ў гэтай справе: персанальная і працы. З матэрыялаў можна было меркаваць, што асоба з псеўданімам „Яўген Чыквін" гэта Яўген Чыквін.

Сведка не ведала таксама, што паказаны ёй дакумент наконт забавязання да супрацоўніцтва з СБ дэпутата з'яўляецца падробкай.

У чарговым адказе на пытанне адваката Чашэйкі-Сахацкага сведка заявіла:

— Дакументы, збіраныя мною, я правярала з уліковымі матэрыяламі. Дакумент, якога не ўдасца праверыць, застаецца ў актах.

Паўтарала раз за разам:

— Дакументацыя не з'яўляецца камплектнай. Не дам рады ўсяго прыпомніць.

Дзялілася сваімі ведамі:

— Функцыянер быў забавязаны атрымаць згоду кіраўніка на тое, каб зарэгістраваць дадзеную асобу як кандыдата на сакрэтнага супрацоўніка. На практыцы здаралася, што такі дакумент не захаваўся.

Сумненні абароны выклікала храналагічная нелагічнасць у датах паміж правядзеннем размовы з г.зв. здабыццём Яўгена Чыквіна да супрацоўніцтва і паданнем з яе нататкі.

Анна П.:

— Можна гэта разумець дваяка: перакваліфікавалі Яўгена Чыквіна на кандыдата на сакрэтнага супрацоўніка, або яго адразу кваліфікавалі ў характары сексота. Тая нататка не з'яўляецца рапартам са здабыццём, бо была б пры тым нейкая прыпіска.

Распытваная пракуроркай Агнешкай Русіловіч сведка сказала:

— На падставе цэласці дакументаў можна прымеркаваць Яўгена Чыквіна да псеўданіма „Вільгельм". Я не спаткалася з тым, каб для сексота не былі ведзены папкі персанальная і працы. Інтэрпрэтацыя запісак ва ўліковым дзённіку датычным люстраванага наводзіла б праблемы, бо яны былі неразборлівыя і было ў іх шмат перакрэсленых слоў.

У сваю чаргу Войцех Ф., які ад уліковага рэферата супрацоўнічаў у гэтай справе з люстрацыйным бюро ІНП, прызнаўся:

— Я бачыў папку Яўгена Чыквіна. Гэта матэрыялы, якія былі ўзноўленыя. Гэтая папка — неарыгінальная. У такой форме яе перадала нам Установа аховы дзяржавы (УАД) у 1991 г. ІНП не знішчыў ні аднаго дакумента з гэтай папкі.

Гэты сведка тлумачыў адрозненні ў прыпісках на папцы дэпутата Чыквіна, з якіх адна інфармуе пра тое, што змяшчаецца ў ёй 112 лістоў, а другая — што 109. Як аказалася ў час першага афіцыйнага падліку лістоў, прымаліся пад увагу лісты незапісаныя, у час другога — ужо не. Адзначыў:

— Ксеракопіі, якія ІНП атрымаў ад УАД, не мелі агаворкі „za zgodność z oryginałem". Іх якасць была розная. Цяжка было расчытаць занатоўкі. Гэты матэрыял мы атрымалі як інфармацыйны, а не доказны. Арыгіналы дакументаў былі ў УАД.

З тлумачэнняў Войцеха Ф. вынікала, што ІНП, пасля таго як перадаў матэрыялы зробленыя ў СБ, распараджаўся копіямі і копіямі копій, таму цяжка адназначна ручацца за арыгінальнасць дакументаў.

На канец гэтай каля двухгадзіннай часткі разбору, дэпутат Чыквін прабаваў заявіць:

— Паводле маёй ацэнкі, дзеянні ІНП у маёй справе накіраваны на прадаўжэнне судовага працэсу і пазбаўленне мяне публічнага даверу.

Суддзя Аліферук, аднак, усекла гэтае выказванне. Дату наступнага разбору вызначыла на 7 ліпеня, калі мае даць паказанні апошні сведка. Меў ён даць паказанні ў час апошняга разбору, аднак прыслаў тлумачэнне сваёй непрысутнасці (быў на службовым абучэнні).

Старшыня судзейскага складу закрыла пасяджэнне:

— Спадзяюся, што гэта будзе нашая апошняя сустрэча.

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Вандроўка ў мінулае і... цяперашняе

(працяг з 21 н-ра)

Заглянуў я і на ставішчанскія могілкі, яны поўнамаштабныя ды і царкоўка там значна большая за палавецкую. На дошцы аб'яў паведамленне, што служба там адбудзецца ў суботу 11 чэрвеня ў дзевяць гадзін раніцы...

Думаў я зайсці яшчэ на археалагічныя раскопкі, што на клюковіцкіх грунтах побач рэчкі Пульвы, але паколькі было макравата, не заходзіў. Прыгадаю толькі коратка пры гэтай нагодзе, што знаходзіцца там гарадзішча, след па буйным сярэдневяковым грамадскім цэнтры. У 1945 годзе адзін земляроб выараў паблізу яго гліняны гаршчок са звыштысячнай колькасцю арабскіх дырхемаў, вычаканеных у пачатку X стагоддзя ў Месапатаміі, магчыма, што ў самім Багдадзе. Магчыма таксама, што ў вярхоўях Пульвы ў сярэднявеччы маглі крыжавацца істотныя гандлёвыя шляхі з усходу на захад і з поўдня на поўнач.

Падаўся я далей у напрамку Вілінава, дзе і думаў завяршыць сваю пешую вандроўку. Калі мінуў расхадныя дарогі ў Вілінава, Такары і Клюковічы, а трэцяй гадзіне, раздаліся куранты з адлеглага паўкіламетра адтуль такароўскага касцёла. На двухкіламетровым адрэзку ад таго разгалінавання ў Вілінава стаіць шмат прыдарожных крыжоў — праваслаўных і каталіцкіх. Бо і тут у мінулым круціліся буйныя рэлігійныя водавароты... Вось што пра Такароўскую парафію піша афіцыйны партал Драгічынскай дыяцэзіі: „Siedzibą dzisiejszej parafii w Tokarach była początkowo miejscowość Wilanowo, zwana dawniej Wielanów lub Wielinów, która leży w odległości 2 km od Tokar. Pierwszy drewniany kościół pw. św. Jana Chrzciciela, św. Mikołaja Biskupa, św. Małgorzaty, św. Zofii i św. Doroty został zbudowany tutaj w roku 1527 przez Mikołaja Skirwin-Krupickiego (zm. przed 1536), dziedzica Krupicz, Wilanowa i Kustyna. W 1536 roku, kiedy jego potomkowie Melchior, Balcer i Jarosz Skirwin-Krupicze przyjęli protestantyzm, kościół w Wilanowie został zamieniony na zbór protestancki (do 1624 r.). (...) Kościół wilanowski w 1728 roku został gruntownie przebudowany do tego stopnia, że niektórzy mówią o wzniesieniu nowego pw. Pana Jezusa Ukrzyżowanego. (...) W ramach represji po Powstaniu Styczniowym — z rozkazu generał-lejtnanta Konstantego von Kaufmana (1818-1882), generał-gubernatora tzw. guberni zachodnich (1865-1866) — w dniu 30 kwietnia 1866 roku kościół został zamknięty, a następnie rozebrany. Beneficjum przejęła Izba Dóbr Państwowych. (...) W 1867 roku materiał budowlany przewieziono do Telatycz, gdzie na cmentarzu zbudowano cerkiew prawosławną pw. Podwyższenia Krzyża Świętego. Podobny los spotkał kaplicę w Klukowiczach, która decyzją (Nr 1143) z dnia 3 września 1867 roku gen. Edwarda hr. Baranowa II (1811-1884), generał-gubernatora wileńskiego (1866-1868), została całkowicie skasowana. Po odzyskaniu niepodległości na nowo w 1919 roku została erygowana rzymskokatolicka parafia — z lokalizacją kościoła w sąsiednich Tokarach". Сёння ў Вілінаве, толькі на ўскраіне вёскі, распаложаны каталіцкія парафіяльныя могілкі. Праваслаўныя жыхары Вілінава сваіх пакойнікаў хаваюць у Катэрцы.

На лавачцы перад адной з хат у Вілінаве сядзела пара пажылых людзей, якіх я і спытаў пра згаданыя прыдарожныя крыжы. Адзін з іх, каталіцкі, з жалезных труб, пастаўлены на павароце дарогі, дзе забіўся на машыне малады чалавек. Іншы, праваслаўны, драўляны, побач таполі, на якой быў павесіўся жыхар Клюковіч. Яшчэ іншы, за разгалінаваннем у напрамку Клюковіч — на месцы, дзе вазака, што вёз дровы ксяндзу, прыдушыў ягоны воз. У напрамку Такароў крыж, дзе загінула траіх мужчын. Дарога, гэта жывое, дынамічнае месца...

Вартавыя бульбянога поля

У Вілінаве два аўтобусныя прыпынкі, на якіх расклады аўтобусаў не супадаюць з сабою. Гэта мяне насцярожыла, але ўсё ж такі я верыў, што наяўны ў інтэрнэце курс збудзецца. Дарэмна я яго чакаў — аўтобус не прыехаў. Рашыў я вярнуцца на шашу з Такароў у напрамку Чаромхі з надзеяй на нейкую падсадку і ў Чаромсе ўспець яшчэ на „Voyager" у Беласток. А палове шостай з такароўскага касцёла зноў раздаліся мілагучныя куранты. У напрамку Чаромхі ішоў я пяць гадзін і за той час не праехала ў той бок ніводная машына! Калі б вярнуцца адзінаццаць стагоддзяў назад, можна было б уявіць абозы купцоў з шырокага свету, спяшаючых у клюковіцкую факторыю...

Крыж каля Янцэвіч

А так, прыйшлося мне любавацца адсутным у Беластоку зорным небам, водарам чыстага паветра ды слухаць канцэрт жаб і начных птушак. І яшчэ канстатаваць, што за дзень без спецыяльнай трэніроўкі можна прайсці шэсцьдзесят кіламетраў. А калі, для прыкладу, па тутэйшых рэйках перастануць ездзіць цягнікі, тады можна будзе замахвацца і на большыя адлегласці.

Крыжы ў Клюковічах

Нараўка

Святліца для ўсіх

У Нараўцы (Гайнаўскі павет) будынак былога дзіцячага садка перабудавалі на святліцу. Цяпер яна добра служыць усім жыхарам Нараўкі і навакольных вёсак. У пасляабедні час прыходзяць сюды дзеці, моладзь і дарослыя. Тут можна карысна і прыемна правесці вольны час.

У пачатку гэтага года здалі святліцу ў карыстанне і назначылі Нэлю Харкевіч з Ляўкова яе загадчыцай. І гэта было самае лепшае рашэнне дырэктаркі Гміннага асяродка культуры і войта Нараўчанскай гміны. З таго часу прайшло пяць месяцаў, а ўжо колькі цікавых культурна-асветных і забаўляльных мерапрыемстваў тут адбылося.

Для моладзі спадарыня Нэля арганізавала, між іншым, заняткі па разьбе па дрэве. Запрасіла да сябе пластыка Малгажату Краўчык. Узор нарысаваны на паперы пераносілі на ліпавыя дошчачкі, затым яго далікатна вырэзвалі долатцам. Дзяўчаты і юнакі ахвотна пяклі крохкае салодкае пірожнае. З саломы і паперы дзяўчаты зрабілі вялікага павука, якім упрыгожылі святліцовую залу. Яны апрача таго выконвалі з каляровай плісаванай паперы кветкі, а з вялікіх аркушаў — адмысловыя фіранкі на вокны.

Захацела моладзь навучыцца сучасных танцаў і такія заняткі ідуць пад кірункам інструктаркі з Гайнаўкі.

Жанчыны з Нараўкі, Янова, Альхоўкі, Міклашэва і Плянты вучацца ад спадарыні Нэлі як можна з агародніны ды фруктаў зрабіць прыгожую кветку, разету або птушку. Такі дэкор (які можна са смакам з'есці) упрыгожыць кожны стол у час сямейнай урачыстасці. У святліцы маладыя і старэйшыя кабеты пяклі хрусты, мазуркі, пернікі і пончыкі — традыцыйныя ды ў версіі „ружы".

Перад велікоднымі святамі ў святліцу запрасілі Марыю Рэент (яна жыхарка Ляўкова), вопытную спецыялістку па крашанні яек у цыбульніку ды ў фарбах і роспісе іх воскам.

У пачатку мая ў святліцы адбылася сустрэча з агароднікам Рафалам Кандрацюком з Лешукоў, які спецыялізуецца ў вырошчванні дэкаратыўных дрэў і кустарнікаў. У Нараўчанскай гміне шмат хто купіў дэкаратыўныя расліны з яго гадавальніка. Падчас сустрэчы да агародніка было шмат пытанняў.

У нараўчанскай святліцы адбываліся ўдалыя танцавальныя вечарыны для пенсіянераў, падчас якіх былі цікавыя конкурсы з узнагародамі.

Вельмі добра, калі ёсць вопытны інструктар і добры арганізатар. А такой асобай з'яўляецца Нэля Харкевіч.

Янка ЦЕЛУШЭЦКІ

Кафедра беларускай культуры
Філалагічны факультэт
Універсітэта ў Беластоку
запрашае на
Беларускія чацвяргі інтэрдысцыплінарны канверсаторый
д-р Лявон Баршчэўскі
Трактаты Чэслава Мілаша ў кантэксце сусветнай літаратуры і яе перакладаў на беларускую мову
26 мая, пачатак у 17.00,
вул. Лінярскага 3, зала 1Б

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Каляровы фестываль

Як пазнаёміцца з сябрамі, якія размаўляюць па-літоўску, чачэнску ці ўкраінску? Найлепш, калі разам выступаем на сцэне. Вось ужо сёмы раз настаўніцы беларускага садка ў Беластоку 18 мая г.г. арганізавалі фестываль для дашкольнікаў нацыянальных меншасцей. У нашым ваяводстве пражываюць беларусы, літоўцы, татары, украінцы, расіяне. У апошнія гады ў Беластоку пасяліліся бежанцы з далёкага Каўказа: чачэнцы. І хаця ўсе яны ходзяць у польскія школы, самі з сабой размаўляюць па-чачэнску. Бацькі вучаць іх народных песень і танцаў. На фестывалі мы пазнаёмілія з Хаўрай і Мірыям Рафаевымі. Дзяўчынкі ў сваіх казачных сукенках выглядалі як прынцэсы. І з такой жа грацыяй і красой праспявалі сваю песню, аздабляючы яе матывамі народнага танца. Подых свежасці ўнеслі таксама літоўскія дашкольнікі з Пунска: Гінтарэ Вяктар, Габрыела Кардоўская і Ранаўдас Янкоўскі, якія

Літоўскія дашольнікі з Пунска: Гінтарэ Вяктар, Габрыела Кардоўская і Ранаўдас Янкоўскі

спявалі песеньку „Божая кароўка". Надзвычай прыгожа і адважна выступілі ўкраінскія дзеткі з Прадшколля № 9 у Бельску-Падляшскім. Асабліва заваражыла маленькая салістка з гучнай песенькай „А ці я не гаспадынька?". Найбольш удзельнікаў прадстаўляла беларусаў. Многія з іх прыехалі з прадшколляў, дзе няма беларускіх аддзелаў. Вось з беларускімі прыпеўкамі выступілі беластоцкія дашкаляты: з садка № 32 Карэля Казімірук з Клеасіна (з песняй „Дзяўчынка беларусачка") і Патрык Галубоўскі з ПШ № 14. Беларускую меншасць прадстаўлялі таксама дзеці з гайнаўскіх прадшколляў № 5 (з песняй „Кот вучоны") і № 1 (з песняй „Цячэ вада"). З беларускай песняй („Шэрая зязюлька") выступілі таксама дзеці з садка № 3 у Бельску-Падляшскім. Не падвялі, зразумела, гаспадары — беларускі садок. Калі заспяваў гурт „Вясёлка", не хацелася іх проста адпусціць са сцэны. Таксама былі дзве цудоўныя салісткі: Наталька Харужая і Юля Баравік. Музычная культура беларускага садка — узор для іншых дзяцей. Дашкольнікі, якія прыязджаюць з Гайнаўкі ці Бельска, часта спяваюць іх песні, запісаныя на CD, а бацькі і настаўнікі шыюць народныя касцюмы.

Народныя касцюмы, як мы пабачылі на прыкладзе чачэнцаў ці літоўцаў, гавораць вельмі шмат пра меншасць. Яны паказваюць нашае адчуванне прыгожасці, падыход да строяў. Часам, як у выпадку беларусаў і ўкраінцаў, касцюмы падобныя. Гэта зразумела. Мы — славяне і братнія народы. Пры ўсіх розніцах і падабенствах варта звяртаць увагу на пераказ слова. Добра, каб перад песняй сказаць два-тры сказы пра што яна. Можна таксама адвесці больш часу для гасцей, каб дзеля адной песенькі не ехалі яны з другога канца ваяводства. Калі беларусы з'яўляюцца гаспадарамі, яны павінны прыдбаць беларускія граматы і сувеніры: кампакт-дыскі з дзіцячай музыкай, вышыванкі або народныя інструменты...

ЗОРКА,
Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Хаўра і Мірыям Рафаевы

Дзеці з гайнаўскага прадшколля № 5

Міра ЛУКША

Мы іграем

Йграе Кузя на бубне,
Рузя на гітары.
Ой, вазьміце вы мяне
У сваю пару.

Заснавалі мы аркестр
Найлепшы ў свеце,
А прынамсі ў горадзе,
У Беластоку.

Йграе Фрузя на трубе,
Франя на фагоце.
А я пара для цябе —
У адным боце!

Тося моцна б'е ў званок.
Ядзя — на гармоніі.
Як станцуем крыжачок,
Хто нас дагоніць?

(З народнага календара)

Лён і вараныя яйкі!

27 мая, *Сідара.* *Прыйшлі Сідары — прыйшлі сіверы.* У гэты дзень дапускаўся налёт халодных вятроў.

28 мая, *Пахома.* Надвор'е рэзка мянялася, халодны вецер адплываў, таму людзі гаварылі: *Пахом павеяў цяплом.* На Пахома стараліся пасадзіць агуркі.

31 мая. *Сем дзеў.* На Сем дзеў сеялі каноплі, паколькі адна са святых дзеў, Матруна, лічылася іх апякункай. Людзі казалі: *Канапелька Матруна, штоб ты ў зямлю махнула.*

2 чэрвеня. *Трох мучанікаў* — зледзянелых старцаў: Фалалея, Аляксандра, Астэрыя. У народзе лічылі гэтае свята пераходным перыядам між зімой і летам. *Няма зімы і няма лета,* — казалі.

3 чэрвеня, *Алены.* Сеялі лён. Працы спадарожнічаў старажытны абрад. Сяўцы апраналі белую кашулю, каб лён вырас чысты. У кашолку з насеннем клалі вараныя яйкі, якія, прыехаўшы на ніву, сейбіт падкідаў угару. Дзякуючы гэтай практыцы лён меў вырасці буйны і з тоўстымі галоўкамі.

Заяц-хвалько

Руская народная казка

Жыў-быў заяц у лесе. Улетку яму добра было, а зімою кепска — даводзілася да сялян на прыгумень бегаць авёс красці.

Прыбягае ён да аднаго селяніна на прыгумень, а тут ужо чарада зайцоў. От ён і пачаў ім хваліцца:

— У мяне не вусы, а вусішчы, не лапы, а лапішчы, не зубы, а зубішчы — я нікога не баюся.

Зайцы і расказалі цётцы вароне пра гэтага хвалька. Цётка варона пайшла хвалька шукаць і знайшла яго пад карчом. Заяц спужаўся:

— Цётка варона, я не буду больш хваліцца!

— А як ты выхваляўся?

— Што ў мяне не вусы, а вусішчы, не лапы, а лапішчы, не зубы, а зубішчы.

Вось яна яго трошкі і паўшчувала:

— Больш не выхваляйся!

Аднойчы сядзела варона на плоце, сабакі яе схапілі і давай шкуматаць, а заяц гэта ўбачыў: «Як бы гэта вароне памагчы?»

Выскачыў на пагорачак і сеў. Сабакі ўбачылі зайца, кінулі варону — ды за ім, а варона зноў на плот. А заяц ад сабак уцёк.

Праз нейкі час варона зноў сустрэла гэтага зайца і кажа яму:

— Вось цяпер ты малайчына, не выхваляка, а сапраўдны смяляка!

Малгосю Пятэльскую ўжо гадоў сем можна сустрэць на шмат якіх беларускіх мерапрыемствах — і ў Беластоку на розных фэстах, і ў Гарадку. З Гарадоччыны — з Меляшкоў і Зарэчан — яе дзядулі і бабулі. А яна ўжо вучыцца ў першым класе! У Беластоку, у ПШ № 5 па вуліцы Каменнай, на Баярах. Рэлігіі ў іх навучае пані Лена Добаш. Сёлета Гося выступіла ў дэкламатарскім конкурсе праваслаўнай паэзіі. Гаварыла верш „Дзецям". Гэта зварот да дзяцей, каб падкормлівалі птушачак — галак, галубоў, сінічак... Вось на вуліцы — сыра і золка, памерзлі яны ў лапкі... Трэба ім шчодрай рукой падкінуць што-небудзь паесці, ды яны нам аддзячаць.

— Ці гэта рэлігійны верш? — пытаюся ў Госі, што катаецца на веласіпедзе па гарадскім рынку ў Беластоку.

— Так, бо птушкі — божае стварэнне! — упэўнена кажа Гося. — І Бог пашкадуе нас, калі будзе трэба. І калі паспачуваем птушкам, весялей будзе на свеце!

Гося — найменшая „птушачка" дома. Яе сястры Марце 30 гадоў, сястры Юстыне — 24! Усе яны любяць спяваць, а Гося іграе яшчэ на флейце!

(лук)

Музыка з кайфам

Здарыляся 27 траўня...

Роўненька 117 гадоў пасля смерці вялікага віртуоза скрыпкі нарадзіўся беларускі гісторык Алег Латышонак, які штодзень жыве ў Беластоку. 131 гадоў, таксама роўненька пасля смерці згаданага генія сусветнага музычнага мастацтва, нарадзіўся „Скрыпа" — класік антысістэмнай музычнай творчасці, які іграе не на скрыпцы, а на гітары ды даволі часта прытым спявае. Віртуоза скрыпкі завуць Нікола Паганіні, „Скрыпа" гэта мянушка беларускага музыкі Сяргея Скрыпнічэнкі. Прычым тут яшчэ і прафесар Латышонак? Спалучае іх усіх дзень 27 траўня. Паколькі наш прафесар займаецца гісторыяй, яго прафесія асацыюецца з назвай гурту „Жыгімонт Ваза", лідарам якога з'яўляецца менавіта „Скрыпа".

Пачаткі гурту даўно забытыя, колькасць альбомаў набліжаецца да дзесяці. Сярод іх — саўндтрэк да фільма, які, здаецца, да сёння не зняты. Альбомы гурту не прадаюцца, але ў сярэдзіне гэтага закалоту ёсць чалавек, які проста шчасліва сябе адчувае. Гэта „Скрыпа", якому музыка вызначае жыццёвы рытм. Ён яе піша і з'яўляецца эрцам „Жыгімонта Вазы". Гэта гурт, які без свайго лідара не існаваў бы, бо на ім трымаецца, а нават ім з'яўляецца, нават калі на сцэне ў час канцэрта выступаюць іншыя музыкі. Сам „Скрыпа" прызнаецца, што ў „Жыгімонце" граюць музыкі, якія ўдзельнічаюць у іншых трох ці чатырох гуртах ды прымушаныя граць часцей там, дзе ёсць грошы. Аднак ніхто за тое не злуецца, бо такая беларуская рэчаіснасць.

„Скрыпа" ад пачатку прытрымліваецца беларускай мовы, бо на такой быў выхаваны і лічыць яе запатрабаванай. Калі хочаш ствараць беларускую культуру, тады беларуская мова абавязковая. Музыка „Жыгімонта Вазы" ўжо не такая відавочная і напэўна не для ўсіх. Гэта напэўна рок, даволі цяжкі, а мо лепш сказаць складаны, часам выкрыўляе вуха, а часам трапляе ў гіт-парады. Найчасцей неспадзявана і нечакана, бо і „Скрыпа" не імкнецца на сілу шукаць слухача ды прысутнічаць у медыях. Ён проста кахае музыку. А любоў пачалася з пяцігадовага ўзросту, калі з-за чысценькага голасу паслалі малога Сярожку ў музычную школу.

i_basovka@o2.pl

Тадэвуш КУНЦЭВІЧ

Дзень дзіцяці

Усе такія добры дзеці
адно пахваліці
найздальнейшыя ў свеце
могуць усё зрабіці.
Хто ў школе акно выбіў
і панішчыў кветкі?
Пан дырэктар? Можа пані?
Напэўна не дзеткі.

Хто зімою босы бегаў
наўкол свае хаты?
Чыя ў гэтым ёсць заслуга:
мамы, дзеда, таты?
Хто чарнілам зрабіў пляму
на новай сурвэце?
Усіх за гэта вініць можна
напэўна не дзеці.
Памятайце штогадова
і бацькі, і маці:
што найбольшае з усіх святаў
гэта Дзень дзіцяці.

Польска-беларуская крыжаванка № 22

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 18:

Мост, нож, атол, шышка, луста, грам, аранж. Кош, жыла, такс, тата, мо, тыраж.

Узнагароды, кампакт дыск з вясновымі песнямі Падляшша *„Агулькі для Ганулькі"* выйграла **Арыядна Бакер** з Непублічнай школы св.св. Кірылы і Мяфодзія ў Беластоку, кніжку Алеся Краўцэвіча *„Рыцары і дойліды Гародні"* — **Габрыель Кузьмін** з Бельска-Падляшкага, *настольную гульню* — **Катажына Шэфлер** з Бельска-Падляшскага, *кампакт з рыцарскай музыкай ВКЛ* — **Мартына Швед** з Бельска-Падляшскага. Віншуем!



Ужо здаўна матуральныя экзамены былі пропускам для далейшай адукацыі, але іх вынікі ў час рэкрутацыі ў вышэйшыя навучальныя ўстановы не былі так вырашальнымі як зараз і таму маладыя людзі з Гайнаўкі ці Бельска-Падляшскага, а можна нават больш за іх бацькі, моцна хвалююцца перад і ў час матуральнага выпрабавання. Ад пісьмовага экзамену па польскай мове, які адбыўся 4 мая, распачаліся матуральныя змаганні і ажно на 23 мая вызначана пісьмовая праверка ведаў і ўмеласцей па беларускай мове і мовах іншых нацыянальных меншасцей, якія жывуць у Польшчы. Да гэтага часу вучні здаюць іншыя пісьмовыя і вусныя экзамены, выступаюць з прэзентацыямі па польскай і ў нашым выпадку па беларускай мовах.

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

ВАЖНАЕ ЖЫЦЦЁВАЕ ВЫПРАБАВАННЕ

Бельскія белліцэісты перад прэзентацыямі

Гайнаўскія белліцэісты з настаўніцай Іалантай Грыгарук пасля прэзентацый

Памяркоўнае хваляванне, якое паяўляецца на некалькі месяцаў раней і спадарожнічае ажно да заканчэння матуральных экзаменаў гэта станоўчы стымул да штораз больш эфектыўнай вучобы, адганяе ляноту, дазваляе спыніць або абмежаваць да мінімуму спартыўныя трэніроўкі, музычныя рэпетыцыі ці іншыя заняткі вучняў. Тады маладыя людзі, якія хочуць паступаць на выбраныя спецыяльнасці ў навучальных установах, маюць моцны штуршок да інтэнсіўнай вучобы. Аднак ёсць і такія асобы, у якіх моцнае хваляванне перад экзаменамі выклікае параліч у вучобе, недавер у свае сілы і магчымасці. У час матуральных выпрабаванняў цяжка ім справіцца нават з простымі задачамі, якія раней выконвалі без асаблівых складанасцей.

— Мы нерваваліся ў час пісьмовых экзаменаў. Не апасаліся асабліва, што недавучаныя ідзем на экзамены, але больш баяліся, што нервы могуць нас з'есці на матуры і з-за гэтага дрэнна напішам, — заявілі Тамаш Лаеўскі і Марыюш Крук.

Раней бывала, што асобам, якія разгубяцца, дапамагалі сябры, падкідваючы перапісаныя на лістоўкі задачы або шпаргалкі. Цяпер, здаючы матуральныя экзамены паводле новых прынцыпаў, такая дапамога малапраўдападобная, хаця тэарэтычна надалей магчымая.

— У час пісьмовага экзамену настаўнікі знаходзяцца спераду залы, ззаду і па баках, так што нават калі ёсць час, каб сябрам дапамагчы, як было, напрыклад, на некаторых пісьмовых экзаменах, то складана гэта зрабіць на вачах настаўнікаў, — згодна гавораць мае маладыя суразмоўцы.

— У гэтым годзе абавязковы экзамен па матэматыцы быў больш складаным, чым у мінулым годзе і я апасаюся ці здам яго. Сядзела я побач настаўнікаў і не магла нават глянуць, якія ёсць закрытыя адказы ў сяброў, якія сядзелі пасярэдзіне залы. Аднак калі б я нават падглянула, як напісаў мой сябра, не магла б машынальна тое ж самае падкрэсліць на сваёй працы, бо ў дасланых у школы работах бывае памешаная чарговасць правільных закрытых адказаў, — сказала адна з белліцэістак.

Заставалася разлічваць на свае сілы, веды і ўмеласці, здабытыя перш за ўсё ў час трохгадовай адукацыі ў звышгімназічных школах. Каб паспяхова справіцца з пісьмовым экзаменам, вучні мусяць набраць прынамсці 30% балаў ад усёй іх колькасці. Калі акажацца, што вучань не справіўся з адным з абавязковых экзаменаў, будзе мог пераздаваць яго ў жніўні.

— Некаторым вучням складана здаць экзамен па матэматыцы. У нашай школе могуць быць вучні, якія не справяцца з гэтым экзаменам. Я бачу, што ёсць такія ліцэісты, якія ставяць перад сабой мэту, каб толькі паспяхова справіцца з усімі матуральнымі экзаменамі. Аднак выдатная большасць нашых вучняў стараецца набраць як найбольш балаў на экзаменах, бо ў час матуры ідзе ўжо сур'ёзнае змаганне за паступленне на добрую спецыяльнасць, а ў выніку за добрую вышэйшую адукацыю і добрую працу, — сказаў дырэктар Бельскага белліцэя Андрэй Сцепанюк.

У гэтым годзе да матуральных экзаменаў прыступіла ў Польшчы каля 400 тысяч вучняў, якія ў час абавязковых пісьмовых экзаменаў змагаліся па польскай мове, матэматыцы, замежнай мове і ў час пісьмовых выпрабаванняў мусілі справіцца з задачамі па іншых выбраных прадметах, згодна з запатрабаваннем вышэйшых навучальных устаноў, куды будуць паступаць выпускнікі. У Гайнаўскім белліцэі да матуральных экзаменаў прыступілі 113 вучняў, а ў Бельскім белліцэі — 145. Загадзя запісваліся здаваць матуральныя экзамены па выбраных прадметах мінулагоднія выпускнікі, якія наогул хацелі паправіць вынікі, але многія з іх так і не паявіліся ў школах, так як было ў мінулых гадах.

Дыскусія наконт патрэбнасці або непатрэбнасці прэзентацый па польскай, а ў нашым выпадку і па беларускай мовах адбылася ўжо ў папярэдніх гадах і зараз можна сказаць, што яны асабліва не перашкаджаюць вучням у час даволі доўгага перыяду здавання матуральных экзаменаў, калі вучні паслухалі парад сваіх настаўнікаў і падрыхтавалі гэтыя ж прэзентацыі загадзя. Хаця іх вынікі не бяруцца пад увагу ў час рэкрутацыі ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, то ў іх час адбываецца праверка культуры слова. Вучні, якія рашаюцца самастойна рыхтаваць прэзентацыі, маюць магчымасць папрацаваць па тэме, якая можа іх зацікавіць.

— Мая тэма да прэзентацыі, гэта „Беларусь у інтэрнэце". Хаця я наведваю розныя беларускамоўныя сайты, то ў час расказу абапёрся ў першую чаргу на сайт „Нівы", — сказаў Марыюш Крук.

— Я расказваў пра сродкі масавай інфармацыі, асаблівую ўвагу адводзячы „Ніве", „Часопісу", Радыё Рацыя, Радыё Беласток і „Праваслаўнаму агляду", — гаварыў іншы вучань.

— Тэма маёй прэзентацыі гэта „Беларуская культура і розныя пакаленні белліцэя", — гаварыла Наталля Пашко. — Я расказвала ў галоўным аб дзвюх дзяўчатах, якія вучацца ў вышэйшых установах Беластока і Варшавы. Выпускніца, якая жыве ў Беластоку, ездзіць на „Басовішча" і ходзіць на беларускія мерапрыемствы, а дзяўчына з Варшавы ездзіць на багаслужбы ў царкву і пасля іх у галоўным спатыкаецца з людзьмі з нашага асяроддзя, хаця таксама бывае і на беларускіх мерапрыемствах.

Яцак Мішчук расказваў пра свой рэгіён і яго жыхароў, асаблівую ўвагу звяртаючы на Альхоўку і Нараўку. Важна, каб настаўнікі, рыхтуючы прапановы для прэзентацый па беларускай мове, запрапанавалі вучням заняцца пытаннямі, якія цікавяць белліцэістаў. Вучні гаварылі, што можна было выбраць цікавыя тэмы для прэзентацый беларускай культуры, нашага рэгіёна, мясцовых абрадаў ці сродкаў масавай інфармацыі. Аднак вялікая частка вучняў, так як і ў мінулых гадах, выбрала тэмы па літаратуры, якой займалася на занятках беларускай мовы.

У час пісьмовага экзамену па беларускай мове вучні будуць выконваць задачы да запрапанаванага тэксту і напішуць сачыненне на адну з дзвюх прапанаваных тэм. На здаванне пісьмовага экзамену па беларускай мове ў пашыранай формуле рашыліся белліцэісты, якія раней сталі лаўрэатамі або фіналістамі Алімпіяды беларускай мовы і ім аўтаматычна будзе ўпісана самая вялікая колькасць балаў, магчымая да здабыцця на пашыраным экзамене.

— Рыхтуючы вучняў да матуральнага экзамену я перш за ўсё вучыў, а пасля напамінаў, як трэба правільна пісаць сачыненні і выконваць задачы да запрапанаванага тэксту, каб атрымаць як найбольш балаў. Зараз арыгінальнасць сачынення не мае ўжо так вялікага значэння, як гэта было ў час старога матуральнага экзамену, хаця ў арыгінальнай і цікава напісанай працы лягчэй знайсці тое, за што камісія будзе ставіць балы. Зараз вучні павінны так пісаць сачыненні, каб у працы можна было знайсці як найбольш згоднага з матуральнымі патарабаваннямі, — сказаў настаўнік Гайнаўскага белліцэя Ян Карчэўскі. — Цяпер цяжка прадбачыць, якія могуць быць тэмы для сачынення і мы нават не стараемся адгадваць іх.

Зараз ужо хіба мінае той перыяд, калі выпускнікі нашых школ марылі распачаць вучобу ў вышэйшых установах на „прэстыжных", як ім паказвалася тады, спецыяльнасцях, нягледзячы ні на ўзровень навучання на выбранай імі спецыяльнасці і не звяртаючы ўвагі на запатрабаванне на выпускнікоў з вывучанай імі прафесіяй. Пасля аказвалася, што здабываючы званне эканаміста ці спецыяліста па службе ў адміністрацыі маладыя людзі станавіліся беспрацоўнымі, бо вышэйшыя навучальныя ўстановы выпусцілі вельмі многа спецыялістаў. Зараз выпускнікі белліцэяў больш дакладна аналізуюць рынак працы і звяртаюць большую ўвагу на рэйтынг вышэйшых навучальных устаноў, у якія хочуць паступаць.

— Больш чым палова вучняў нашага класа збіраецца паступаць у Медыцынскі ўніверсітэт у Беластоку. Хочам вучыцца на радыялогіі, рэабілітацыі, публічным здароўі і іншых спецыяльнасцях. Частка з нас будзе таксама падаваць дакументы на лекарскае аддзяленне, але туды складана трапіць, бо вельмі вялікая канкурэнцыя. Напрыклад, у мінулым годзе толькі адзін вучань Бельскага белліцэя стаў вучыцца на лекара, — расказваюць Якуб Малец, Бася Кубай, Магда Аксянтовіч і Агнешка Шайкоўская.

— З нашага матэматычна-геаграфічнага класа мае сябры хочуць паступаць найчасцей у політэхнічныя інстытуты і ўніверсітэты, — кажа Бажэна Якубюк.

У час матуральных экзаменаў толькі частка белліцэістаў рашаецца рассакрэціць перад сябрамі, а тым болей публічна, для прэсы, свае планы. Можа і таму я не наткнуўся на вучняў, якія выбралі беларускую філалогію. Аднак адзін з белліцэістаў сказаў, што некаторыя школьныя сябры могуць падаваць дакументы на беларускую філалогію ў якасці аднаго з варыянтаў далейшай адукацыі.

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

Аб Анатолю Сысе

Чарговая сустрэча ў дыскусійным клубе Аб'яднання бацькоў і дзяцей вывучаючых беларускую мову „АБ-БА" сарганізаваная была з нагоды шостай гадавіны з дня смерці аднаго з найвыдатных паэтаў Беларусі пералому васьмідзесятых і дзевяностых гадоў мінулага стагоддзя Анатоля Сыса. Расказвалі пра яго журналісткі „Нівы" Міра Лукша і Ганна Кандрацюк-Свярубская, а таксама вядучы сустрэчу тэлерэпарцёр Мікола Ваўранюк, аўтар фільма „Сыс пра Сыса", прысвечанага творцу.

— Пры жыцці выдаў ён няшмат, бо толькі дзве кніжкі: „Пан Лес" [1989 — М. Х.] і „Агмень" [1988 г. — М. Х.]. І на абедзвюх напісана, што яны — дэбют. Яшчэ пры жыцці выйшла яго кніга „Сыс". Па сутнасці складваецца яна з дзвюх папярэдніх, — уводзіў у спатканне Мікола Ваўранюк. — Тым не менш яго значэнне для культурнага, літаратурнага жыцця Мінска, Беларусі ў палове дзевяностых гадоў было вялікае. Быў ён у спрэчцы з мінскім літаратурным асяроддзем. Ён сцвярджаў, што гэта ад прыроды можна браць сілу. Роздумы пра паэта — „харунжага новай беларускай паэзіі", вядомага таксама з хуліганска-п'яных скандалаў, м.інш. у Доме літаратара ў Мінску — папярэдзіў фільм Міколы Ваўранюка. Галоўным расказчыкам з'яўляецца тут іншы паэт, калега Анатоля, зямляк і далёкі сваяк — Сяргей Сыс. Расказваюць аб ім м.інш. яго сястра Тамара Грыб, маці Сяргея Сыса, стрыечны брат Аляксандр, сябры, настаўнікі і суседзі. Адна з настаўніц водзіць гледачоў па мемарыяльнай зале ў школе, у якую хадзіў паэт. Шмат кадраў фільма паказвае Дняпро, над якім расцягнута родная вёска паэта — Гарошкаў, а ў якую вяртаўся ў час вучобы ва ўніверсітэце ў Гомелі, а пасля з Мінска.

— Яго вершы былі цяжкія. Я прасіла, каб напісаў штосьці, каб лепш на душы рабілася, — кажа адна з блізкіх паэту гераінь фільма.

Маці Сяргея не скрывае: „Я яго вершаў спачатку не разумела".

У час сустрэчы Ганна Кандрацюк-Свярубская, аўтарка збору апублікаваных раней у „Ніве" рэпартажаў „Дзядоўскае турнэ з Анатолем С." спаслалася на ўспаміны са свайго падарожжа разам з Мірай Лукшай у ваколіцы месца адкуль родам Анатоль Сыс, між іншым і над Дняпро:

— Ад гэтай ракі б'е магічная сіла. Невыпадкова вялікія паэты нараджаюцца над вялікімі рэкамі і морам.

Дзялілася расказамі, якія тады пачула, і тагачаснымі роздумамі:

— Анатоль у Гарошкаве спыняўся ў адной з хат, у Бельскіх. Тут мыўся, чысціў пазногці. Толькі тады ішоў да мамы. Быў незвычайна шчыры. У Мінску былі здзіўленыя, што ёсць такая шчырасць, ды ў Гарошкаве — гэта нармальнасць. Калі камусьці спадабалася яго майка, дык ён яе здымаў і аддаваў. Быў адораны файнай людскай сардэчнасцю. Людзі ў Гарошкаве маюць сваё пачуццё гонару. Напэўна ўзмацняе іх прырода.

Мікола Ваўранюк уключыўся:

— Там людзі маюць вельмі глыбока ўрослае карэнне.

Міра Лукша, якая ведала паэта — як гэта акрэсліў Мікола Ваўранюк — найлепш з усіх прысутных на сустрэчы, расказвала:

— Калі размаўлялі мы там з людзьмі, я мела ўражанне, што чую голас Толіка. Такі самы, моцны голас мае яго стрыечны брат і таксама адчуваецца ў ім нейкая нясмеласць і далікатнасць, хоць таксама ён рослы, вялікі. Толік, бывала, хацеў, каб яго пагладзіць па галаве, палашчыць, а прытым меў постаць баксёра.

Успамінала:

— Думаў многа пра смерць. Сітуацыя ў Беларусі мела вялікі ўплыў на яго псіхіку. Верыў у моц слова.

Мікола Ваўранюк:

— Кожнаму, хто цяпреў, спачуваў. З другога боку — быў дзікі і жорсткі.

Міра Лукша:

— Быў ён таксама правакатарам. Хацеў быць акцёрам, ды не паступіў у тэатральную акадэмію. Знакаміта чытаў свае вершы, меў выдатна пастаўлены голас. Я была адной з апошніх асоб, якія бачылі яго жывым. У час нашых сустрэч даходзіла да страшных сітуацый. Аднойчы ўвечары раптам ўз'ёршыўся, падышоў да акна, і завыў. Сказаў: „Ты не спалохалася!". Мяне, спячую, будзіў сярод ночы і пытаўся, а пасля адказваў: „Ты нават у сне гаворыш па-беларуску!".

Ганна Кандрацюк-Свярубская:

— Уся ягоная няспеласць і феномен гэта рысы чалавека перажываючага кашмар з-за таго, што ён непатрэбны і неацэнены належным чынам. Гэта праблема ўсіх нас беларусаў — адчуваць сябе скончаным у 45 гадоў, так як ён. Ён з'яўляецца прыкладам таго, што робіцца з чалавекам, які не развіваецца і не мае падтрымкі. Канаў на вачах усяго Мінска і ўсяе Беларусі.

Аб сваіх сустрэчах з Анатолем Сысам расказваў таксама беластоцкі паэт Віктар Швед:

— Я бачыў яго некалькі раз у Мінску. Працаваў ён тады на тэлебачанні. У час аднаго з аўтарскіх вечароў, з удзелам шматлікіх пісьменнікаў, увайшоў на сцэну. Узяў з-за століка чатыры крэслы, паставіў іх у адзін радок і лёг на іх. Прасілі, каб сышоў са сцэны, а ён — нічога. Нарэшце яго знеслі. І не быў п'яны. Пасля нармальна чытаў свае вершы. Тады я пачуў, што гэта „скандаліст".

Мікола Ваўранюк:

— Сыс у сваёй творчасці старамодны, а прытым вельмі беларускі. Не ўдасца яго перакласці не так на іншую мову, як на іншую культуру.

Ганна Кандрацюк-Свярубская:

— Ён — сучасны беларускі класік.

Міра Лукша:

— Пра Сыса напісалі ўжо больш чым ён сам напісаў. На блогах выпісвалі нават, што ён „заручаны з д'яблам". Ствараецца пра яго легенда. Мо большая, чым ён сапраўды быў.

Удзельнікі сустрэчы прыгадалі Адама Глёбуса — найбольшага бадай крытыка пры жыцці Анатоля Сыса — народжанага год раней за яго паэта і мастака. Міра Лукша сцвердзіла:

— Мне здаецца, што ў Глёбуса быў комплекс Сыса. Сыс меў харызму, а Глёбус яе сабе „рабіў". Паміж імі было змаганне, хто з іх лепшы, больш сучасны, больш беларускі.

Аліна Ваўранюк з Аб'яднання „АБ-БА":

— Апрача адной кнігі, няма аналітычнага тэксту пра творчасць Сыса. На блогах, калі людзі пішуць пра Сыса, ды сапраўды перш за ўсё пра сябе ў яго кантэксце. Сыс амаль да ўсіх класікаў гаварыў на „ты", і гэта таксама быў скандал. Быў вельмі ўражлівы. Сам у нейкі момант, аднак, не ведаў, як яму быць і кім быць. Прыкрываў гэта ўсё хамствам і жорсткасцю.

Мікола Ваўранюк:

— Можа гэтая чорная легенда прыцягне будучых чытачоў.

Ганна Кандрацюк-Свярубская:

— Ён ніколі не меў добрага часу.

Аліна Ваўранюк:

— Трэба быць беларусам і кахаць беларушчыну, каб кахаць Сыса. Палякам можа ён здавацца нават банальным.

Фота і тэкст Ганны КАНДРАЦЮК

Хадановіч і Мілаш у Беластоку

— Я не думаў, што прыйдзецца мне выступаць у такой знакамітай кампаніі! — прывітаў аўдыторыю беларускіх чацвяргоў паэт Андрэй Хадановіч. Натхненне для слоў прывітання прынёс загаловак лекцыі, запісаны крэйдай на традыцыйнай дошцы: *Чэслаў Мілаш і Андрэй Хадановіч*. Папраўдзе тэма даклада гучала звычайна: *Андрэй Хадановіч — паэт і перакладчык Чэслава Мілаша*.

Сустрэча адбылася не ў чацвер, а ў сераду, 11 мая, г.г.

— У віленскія гады Чэслаў Мілаш прымаў удзел у літаратурных серадах, таму замена чацвярга на сераду тут апраўданая, — адзначыла вядучая д-р Лена Глагоўская.

На самай справе атрымалася так з-за графіка Андрэя Хадановіча. Паэт прыехаў у Беласток проста з Кракава, дзе як адзіны прадстаўнік Беларусі прымаў удзел у Фестывалі творчасці Чэслава Мілаша.

— Творчасць Мілаша настолькі жыва паўплывала на маё жыццё, што з рускамоўнага хлапца я зрабіўся беларускім паэтам, — адзначыў госць з Мінска. — Гэты працэс пачаўся разам з перакладам яго вершаў на беларускую мову, яшчэ ў 1990-я гады. Сёння ў Беларусі ёсць цікавасць да асобы Мілаша не толькі па прычыне 100 гадавіны з дня нараджэння. Хутчэй захапляе культурны кантэкст Вялікага Княства Літоўскага ў творчасці польскага паэта. Таму данесці яго спадчыну беларускаму чытачу справа патрэбная і перспектыўная. Што тады зроблена ў Мінску? У апошнім нумары літаратурнага часопіса „Дзеяслоў" надрукаваныя фрагменты перакладаў „Зямлі Улро", „Даліны Ісы", „Радзімай Еўропы", якія восенню выйдуць асобнай кнігай. Андрэй Хадановіч упэўнены ў паспяховасці праекта:

— Чэслаў Мілаш для мяне ўзор шчырасці і несупярэчнасці ў літаратуры. Ён — крыніца і настаўнік.

Паколькі сустрэча адбывалася да кракаўскага выступлення, перакладчык не хацеў распавядаць пра сваю праграму і планы. Сказаў адно пра свае пераклады і прэзентацыю сваіх твораў.

Здаецца, на гэты момант і чакала беластоцкая аўдыторыя. Анрэй Хадановіч, зразумела, прачытаў сваё. Пачаў з „Арфея. Эўрыдыкі. Герпеса", дзеянне якога адбываецца ў мінскім метро.

... Мой родны кут, як ты мне...
Паважаныя пасажыры,
пры карыстаньні эскалятарам
не апускайце рэчаў
на прыступкі і парэнчы!
Пазьбягайце трапляньня душы
ў шчыліны
між рухомымі й нерухомымі
часткамі эскалятара!...

Тыя хто чакаў
скрыпкі ў падзямельным пераходзе,
абаміліся — ён не выйшаў.
Ён знік у нетрах, і
няма таго, што раньш....

Прыведзены фрагмент быў надрукаваны ў зборніку „Бэрлібры" з 2008 года. І калі раней выклікаў пачуцё гумару, сёння, пасля трагічных падзей у мінскім метро, прамовіў зусім па-іншаму. Андрэй Хадановіч, вядомы бліскучай іроніяй і пачуццём гумару, усё ж не змог наклікаць бестурботны настрой радасці, за што прасіў, дарэчы, прабачэння:

— Вельмі стараўся, каб не было сумна, а ўсё ж яно вылезла...

Прысутныя на вечарыне госці атрымалі на канец асалоду ад эфектыўнай дэкламацыі верша (вядомага таксама як песня) „Беларускі мужчына". Хадановіч пакінуў Беласток з надзеяй на новы шэдэўр:

— Заўтра мне прыйдзецца вяртацца ў Кракаў цягніком „Чэслаў Мілаш", — падмаргнуў ён на развітанне.

Шмат пытанняў у адрас Андрэя Хадановіча, старшыні Беларускага ПЭН-Цэнтра, датычыла Нобельскай прэміі. Ці ёсць рэальны шанс, каб атрымаў яе паэт Уладзімір Някляеў, класік, які зараз прабывае ў хатнім арышце?

— Мы працуем у гэтым накірунку, — адказаў госць сустрэчы. — Зараз мы засяроджаны на перакладах прозы паэта. Чаму? Бо проза больш зразумелая еўрапейскаму чытачу. З паэзіяй праблема. Каб яна атрымала сапраўднае гучанне, яе мусіць перакласці іншы вялікі паэт!

(Не)шчаслівая трынаццатка (10)

Анатоль ПАРЭМБСКІ

Ужо на другі дзень пасля ўступлення савецкіх войск, 10 ліпеня 1944 года, на ўчастку Ванькі ў хвайняку на абшары болей чым аднаго гектара расклалася гаспадарская часць — кухня, пякарня, бойня і склады з правіянтам. Камандзірам часці быў маёр, кітаец, які ўжо ведаў, дзе будзе тут савецка-польская мяжа. Граніцай будзе рэчка Свіслач, а гэта значыць, што Вырэмбы ўжо будуць у Польшчы. Пра Сталіна маёр сказаў: „Сёння канчаецца вайна, а заўтра мы яго выкінем". Хто былі тыя „мы" — невядома. Аказалася, што гэтых „мы" Сталін выкідаў яшчэ доўга. Гэтая часць савецкіх войск стаяла тут больш за два месяцы. Прыпомнілася мне тады, што калі энкавэдзіст Арлоў добра выпіў, заўжды плакаў. Чаму ён плакаў, не даведаўся я ніколі.

Заканчэнне вайны 9 мая 1945 года было не меней радасным здарэннем у Ванькавай хаце, чым вяртанне яго з турмы ці вызваленне з-пад нямецкай акупацыі ў ліпені 1944 года.

Польскае падполле, якое ў час нямецкай акупацыі „stało z bronią u nogi", пачало моцна актывізавацца. Паявіліся ўзброеныя групы, якія былі процій польскай владзы людовэй, а беларусаў страшылі, каб выязджалі ў „рай". Нярэдка даходзіла да забойстваў.

На падставе пагаднення паміж урадамі Савецкага Саюза і Народнай Польшчы паявіліся савецкія агенты, якія заахвочвалі беларусаў, пражываючых на Беласточчыне, у межах польскай дзяржавы, выязджаць на пастаяннае жыхарства ў Савецкі Саюз. Такія агенты няраз паяўляліся і ў Ванькавай хаце, ды намовіць яго на выезд у невядомае ім не ўдавалася. Адзін з іх пазнаёміўся з Нінай Казёл, якая ўжо жыла ў мамы ў Гарадку. Пасля пару візітаў агентаў у Ванькавай хаце, замест таго, каб намовіць Ваньку да выезду ў Савецкі Саюз, знаёмы Ніны, пасля добрай выпіўкі, сказаў: „Ты, дзядзя, нідзе не выбірайся, ніхто табе нідзе не насадзіў картошкі, ані не паставіў хаты". Неўзабаве за гэтага агента Ніна выйшла замуж. Пасяліліся яны ў Ваўкавыску.

Адначасова, калі савецкія агенты заахвочвалі беларусаў да выезду ў Савецкі Саюз, польскае падполле страшыла, што калі яны не паедуць цяпер ахвотна, дык выкінуць іх сілай у той „рай". І так раз дзякуючы савецкай агітацыі, другі — ад страху перад польскімі нацыяналістамі шмат беларусаў Беласточчыны апынулася за граніцай сваёй бацькаўшчыны. Ваньку, здаецца, „трынаццатка" пакінула на сваёй роднай зямлі. Ваньку страшылі яшчэ і ў 1947 г. выгнаннем у „рай". Ды значная большасць палякаў да беларусаў адносілася вельмі добра, таксама і да Ванькі.

Падчас вайны ад 1 верасня 1939 г. да 9 мая 1945 г. на Вырэмбах не згінуў з рук акупантаў ні адзін чалавек, хоць небяспечных хвілін было досыць многа, а то дзякуючы такім асобам як А. Т., Ю. Р., В. М. і іншым. Нікога саветы не вывезлі ў Сібір, а ў немцаў Вырэмбы патрапілі выкупіцца, напрыклад, ад вывазкі. Нямецкія даносчыкі жылі па-за Вырэмбамі. Вайна людзей тут згуртавала, адзін аднаму даравалі крыўды. Палякі і беларусы, каталікі і праваслаўныя хадзілі як трэба і ў касцёл, і царкву, гналі самагонку, разам гулялі на вяселлях і хрысцінах, сумавалі на пахаваннях. Ваньку хацелі адпомсціць тыя людзі, якія не ўспелі яго знішчыць перад вайной. Чым далей было пасля вайны, станавілася спакайней, хоць даходзіла да забойстваў, часта людзей, якія былі ва ўладах, а нават у падполлі забівалі сваіх па ідэі, калі хтось прабаваў думаць па-свойму.

Ванька заняўся гаспадаркай, што падупала падчас шасці гадоў вайны, і далей дружыў з бацюшкам Касперскім, а Ульяна хадзіла, як здаўна звыкла, кожную нядзелю ў царкву. Дзеці падарасталі і пайшлі ў людзі. Ульяна, перажыўшы столькі няшчасцяў і перад вайной, а найбольш пры нямецкай акупацыі, ды і ў час пасля вайны, калі саветы заахвочвалі ехаць у Савецкі Саюз, а польскія нацыяналісты выганялі ў „рай", падупала на здароўі і адышла ў вечнасць у 1956 годзе.

Калі ў час рэвалюцыі 1905 г. падпольшчыкі хацелі былі забіць бацюшку ў Барыку, а Ванька, даведаўшыся пра гэта, яго перасцярог і мо таму бацюшка ўратаваўся ад смерці, за тое падарыў ён Ваньку два гектары зямлі. Карыстацца гэтай зямлёй Ваньку не дала першая сусветная вайна. Пасля вайны польская ўлада не прызнавала важнымі царскіх дакументаў. У 1974 годзе сын Ванькі і Ульяны, Анатоль, пасяліўся ў Валілах-Станцыі — гэта адзін кіламетр ад Барыка — пастараўся набыць зямлю, дзе быў і ўчастак абяцаны Ваньку бацюшкам. Ад 1974 г. Ванька быў блізка зямлі, якую стаптаў уздоўж і ўпоперак, служыўшы на плябаніі. Як жа ён хацеў паглядзець і ступіць на гэтую зямлю! І ступіў. Сын Анатоль толькі прыкмеціў, як Ванька выцірае слёзы, чаго ён і не скрываў. Расказаў і паказаў, дзе было аж пяць крыніц, а ручайкі з іх цяклі ў Супрасль. Цяпер засталася толькі адна, і мала яна жывотная. Не было лета, каб Ванька не наведаў у Барыку добра вядомыя з маладосці мясціны. Тады відаць было слёзы ў яго вачах. Пасля візіту ў „Папоўшчыне" казаў: „Спакойна магу паміраць". Наведваў Ванька „Папоўшчыну" дзесяць гадоў, а апошні раз быў там месяц да свае смерці, яшчэ пры добрай памяці і ў ненайгоршым здароўі. Дваццаць хвілін да смерці Ванька сказаў: „На той свет адыду шчаслівы".

Адышоў у вечнасць Ванька 7 лістапада 1986 года.

http://sonca.org

Беларуская нацыянальная свядомасць рэч даволі неадназначная. Прычым гэтая неадназначнасць заўважаецца як у людзей, што жывуць у Беларусі, так і ў тых, хто лічыць сябе беларусамі ў Польшчы. І там, і там яна нібыта існуе, хоць, каб яе ўбачыць, трэба зрабіць немалыя намаганні. У той жа час адсутнасць жывой патрэбы быць беларусам і называць сябе такім у многіх праваслаўных жыхароў Падляшша праяўляецца яскрава. І патрэбны значныя высілкі нацыянальных арганізацый, каб людзі тут запісаліся беларусамі падчас праходзячага перапісу.

Разам з тым аб поўным заняпадзе беларушчыны на Падляшшы казаць заўчасна. Па меншай меры пакуль існуюць маладыя людзі, якім залежыць быць беларусамі і рабіць нешта дзеля ўмацавання беларускай самасвядомасці сярод іншых. Адным з прыкладаў такіх арганізацый з'яўляецца Звяз беларускай моладзі, сайт якога месціцца ў інтэрнэце па адрасе **http://sonca.org.**

Сайт мае назву „Сонца". Пэўна, тым самым маладыя людзі хочуць паказаць, што сваімі дзеяннямі яны асвятляюць беларускае наваколле Беласточчыны. Адметна, што дэвізам сябры Звяза абралі словы „Загляне сонца і ў наша аконца", якія напачатку XX стагоддзя былі назвай беларускага выдавецкага таварыства ў Санкт-Пецярбургу, а таксама радком з аднайменнага верша каталіцкага беларуса Казіміра Сваяка, што служыў калісьці на Падляшшы. Тым самым бачна, што маладзёны пазіцыянуюць сябе як ідэйныя нашчадкі беларускіх адраджэнцаў, жыўшых сто гадоў таму.

Што ж тычыцца ўласна сайта, то ён змяшчае інфармацыю адразу на дзвюх мовах — польскай і беларускай. Такім чынам па форме гэтая інтэрнэт-прадстаўніцтва арганізацыі не надта адрозніваецца ад завядзёнкі ў большасці беларускіх медыяў, дзе падача інфармацыі вядзецца разам з беларускай на рускай альбо польскай мовах.

Сайт уверсе змяшчае нямнога рубрык. Першая з іх „Aktualności" адначасова з'яўляецца галоўнай старонкай цэлай інтэрнэт-бачыны. Там, з большага па-польску, месцяцца разнастайныя навінныя паведамленні, што так ці інакш тычацца дзейнасці ЗБМ. Праўда, абнаўляюцца яны цяпер не надта часта — апошняе паведамленне распавядае аб падзеях сакавіка гэтага года.

Аб тым, што ўяўляе сабой Звяз беларускай моладзі цікаўны інтэрнэт-карыстальнік можа даведацца на аднайменнай старонцы. Самапрэзентацыя Звяза мае ажно тры моўныя версіі — дадаецца яшчэ англійская. „Ідэя ўтварэньня беларускай маладзёвай арганізацыі ў палове 80 гадоў узьнікла на хвалі адраджэньня нацыянальнай сьвядомасьці ў студэнцкім асяродзьдзі, якое было ў галоўным, зьвязанае зь Беларускім Аб'яднаньнем Студэнтаў. Але ажыцьцявілася яна ажно пасьля некалькіх гадоў і зь ініцыятывы маладых — вучняў сярэдніх школ зь Бельска-Падляшскага, Гайнаўкі ды Беластоку", — распавядаюць ідэйныя натхняльнікі ЗБМ і яго сайта. Далей ідзе невялікі экскурс у гісторыю станаўлення арганізацыі, дзе ўвага засяроджваецца на тым, што галоўным адрасатам усіх мерапрыемстваў Звяза з'яўляецца моладзь.

Адной з найбольш вартых увагі падаецца рубрыка „Białoruś — Białorusini", дзе змешчаныя артыкулы як на сучасныя, так і на гістарычныя тэмы, што тычацца Беларусі і беларускага соцыума.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

С БЕЛАРУСІ ы

Феномен Касцюшкі

Калі задацца пытаннем — хто з ураджэнцаў беларускай зямлі найбольш вядомы ў свеце, то адказ будзе адназначны. Так, гэта Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка, чалавек з доўгім імем, унікальнай біяграфіяй і геаграфіяй, арэолам славы і самоты. Такія асобы нараджаюцца раз у сто гадоў і з місіяй прынесці ў гэты свет нешта такое, чаго раней не было. Такія постаці складаюць гонар усяму чалавечаму роду. Невыпадкова, што яму пастаўлены помнікі ў Польшчы, ЗША, Швейцарыі, ён абвешчаны ганаровым грамадзянінам Францыі, найбольш высокая гара Аўстраліі называецца ў гонар Касцюшкі, яго імем названы горад у амерыканскім штаце Місісіпі, а таксама астравы на Алясцы.

У 1998 годзе мне пашчасціла наведаць сталіцу Злучаных Штатаў Амерыкі — Вашынгтон. Адно з самых дарагіх фота з той паездкі — здымак на фоне коннага помніка нашаму славутаму земляку. Гэты помнік стаіць ужо сто гадоў! Асоб, якія заслужылі такі помнік на тым цэнтральным пляцы толькі чатыры. Касцюшка яшчэ пры жыцці заслужыў і амерыканскае грамадзянства, і пажыццёвую пенсію. Ён быў асабіста знаёмы з Джорджам Вашынгтонам, ад якога атрымаў у падарунак пару пісталетаў, сябраваў з Томасам Джэферсанам, аўтарам славутай Дэкларацыі незалежнасці, пазней прэзідэнтам ЗША. Але няўрымслівасць натуры не дала спакойна чакаць старасці. Ён вярнуўся на радзіму, каб працягваць сваю місію змагара за незалежнасць народаў. Паўстанне 1794 года пацярпела паразу, а цяжка паранены Касцюшка трапіў у расейскі палон. Сядзець яму ў Петрапаўлаўскай крэпасці і іншых турмах доўга, а мо і пажыццёва, каб не змена ўлады ў Расеі. Але ягоная моц духу была ацэнена нават цемрашалкай Кацярынай II, а заступіўшы яе Павел I, арыентаваны на еўрапейскія каштоўнасці, даў Касцюшку вольнасць.

Можна бясконца спрачацца наконт нацыянальнай прыналежнасці Касцюшкі, хоць гэта не мае ніякага сэнсу. Зрэшты, ён сам выразна акрэсліў самавызначальны прыярытэт: „Кім жа я з'яўляюся? Хіба я не ліцвін, Ваш зямляк, Вамі абраны?.." — пісаў ён у 1790 годзе ў рэзкім лісце да генерала Несялоўскага, патрабуючы пераводу з польскага войска ў шыхты Вялікага Княства Літоўскага.

Удзячныя амерыканцы выдаткавалі сродкі на адбудову сямейнай сядзібы Касцюшкаў, што ў Марачоўшчыне пад Косавам (цяпер Івацэвіцкі раён). Зараз там месціцца выдатны музей, ўпарадкавана і наваколле, што стварае цэлы экскурсійны комплекс. Адроджаны палацава-паркавы ансамбль, у які ўваходзяць сядзіба з мемарыяльнай шыльдай, памятны камень, студня з жураўлём, кавярня „У Тадэвуша", буслянка, возера Круглае з выспай, палац Пуслоўскіх XIX стагоддзя, яшчэ адно безыменнае возера, аўтамабільныя стаянкі, адміністрацыйны будынак, гаспадарчы падворак, адмысловыя драўляныя платы. У лютым 2010 года давялося трапіць туды на святкаванне ўгодкаў славутага ваяра і мысляра. Быў прыгожы дзень, снег іскрыўся на сонцы, а краявіды зачароўвалі вока някідкім хараством і прыроднай гармоніяй. Але беларусы былі падзеленыя і на гэтым святкаванні. Амерыканскія дыпламаты прыехалі і былі разам з афіцыйнымі асобамі (яшчэ раз стала прыкра, што апошнія выбары выйгралі не рэспубліканцы!). „Нефармалы" святкавалі асобна. З беларускіх дэмакратычных палітыкаў быў Андрэй Саннікаў. Цікава, што ён мае блізкіх сваякоў па прозвішчы Касцюшка. Сёння Саннікаў у турме — ён разам з іншымі патрыётамі выступаў за вольнасць у сваёй краіне. А значыць, мара нашага вялікага продка з урочышча Марачоўшчына дагэтуль не рэалізаваная.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Віктар БУРА

Даніна павагі салдатам

Рання вясна... Над галавою расхінула свой парасон блакітнае неба, а халодны вецярок час ад часу шапаціць лістоўем ліпаў і бяроз. Душу паволі агортвае ціхі сум, калі глядзіш на ўскладанне вянкоў на могільніку савецкіх салдат, якое адбылося 9 мая 2011 года на гарадскім могільніку па вуліцы Высоцкага ў Беластоку.

На ўрачыстасць прыйшлі людзі з Богам у душы і дабрынёй у сэрцы. Позірк накіроўваецца ў нябачную далеч вечнасці. На могілках савецкіх салдат шматлюдна. Пачынаецца жалобны мітынг, у якім удзельнічаюць дыпламаты Генконсульства Беларусі ў Беластоку, прадстаўнікі гарадской і ваяводскай адміністрацыі, войты гмін, старасты, духавенства, польскія і беларускія пагранічнікі і мытнікі, ветэраны, палітыкі, дзеячы няўрадавых арганізацый, у тым ліку БГКТ і РКПО, бізнесмены, прадстаўнікі СМІ. Сабраліся яны, каб памаліцца за душы маладых людзей, якія знайшлі ў нас, на Беласточчыне, вечны спачын. У 1944 годзе загінулі яны на полі бою пры вызваленні нашай зямлі. Святары моляцца, прыгожа спявае царкоўны хор, людзі стаяць з запаленымі свечкамі ў руках. У такія хвіліны адчуваецца сувязь паміж небам і зямлёй, паміж жывымі і тымі, хто адышоў ад нас навечна.

Сабраныя на жалобным мітынгу падыходзяць у задуменнай цішыні да паасобных магілак, запальваюць знічы і свечкі, а да помніка салдатам Савецкай Арміі ўскладаюць вянкі і кветкі. Прысутнасць маладых людзей сярод пажылых ветэранаў абнадзейвае, што памяць пра загінуўшых на вайне застанецца ў памяці наступных пакаленняў.

На могілках нельга не задумацца над каштоўнасцямі чалавечага жыцця, пра блізкасць вечнасці. На маю думку чалавек, які клапоціцца пра душу іншага чалавека, учыняе дабро і таксама збаўляе сваю душу. „Гэтыя салдаты, якія воляй лёсу апынуліся ў нас і тут аддалі сваё жыццё, уваскрэслі ў нашай памяці", — сказала са слязамі жанчына, якая прыйшла на мерапрыемства са сваім сынам-гімназістам.

ФОТА Віктара БУРЫ

Аляксандр Берабеня — генконсул Беларусі ў Беластоку

Пасля ўрачыстасці на могільніку ў агародзе Генкольсульства Рэспублікі Беларусь адбылася сустрэча з ветэранамі і канцэрт артыстаў Вялікага тэатра оперы і балета, якія спявалі папулярныя ваенныя песні, у тым ліку „Бьётся в тесной печурке огонь", „Синий платочек", „Катюша". Ветэраны абменьваліся ўспамінамі і стоячы праспявалі „День победы". Песні мабілізавалі салдат на подзвігі. Напрыклад, песня „Вставай, страна огромная" гучыць пампезна і цяпер і да глыбіні ўражвае душу.

Няма сумненняў, што Савецкі Саюз вызваліў ад нямецкіх фашыстаў многа краін і народаў. Сёння нашае насельніцтва шануе памяць савецкіх салдат, дбае пра іх магілы. Сабраныя 9 мая г.г. у Генконсульстве Рэспублікі Беларусь у Беластоку 66 гадавіну Вялікай Перамогі адсвяткавалі дастойна, з высока паднятай галавой. Беларусь — краіна, якая не перапісвае гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і не аддае перамогі ў чужыя рукі.

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — страфу Дануты Бічэль-Загнетавай.

1. перапончатакрылае насякомае з джалам = 21 _ 2 _ 88 _;
2. павадок для прывязвання жывёлы = 82 _ 55 _ 89 _ 90 _ 74 _ 72 _ 73 __;
3. газападобнае паліва = 48 _ 31 _ 33 _;
4. без яго мужык не перажагнаецца = 69 _ 71 _ 70 _ 45 _;
5. махлярская шайка = 91 _ 36 _ 37 _ 38 _ 92 _;
6. лісцевае дрэва, сімвал фальшу і падробкі = 41 _ 42 _ 40 _ 39 _;
7. колер шэрсці ў жывёлы = 6 _ 7 _ 81 _ 79 _ 80 _;
8. у Каўнасе завуць яго Нямунасам = 13 _ 11 _ 12 _ 44 _ 54 _;
9. бацька Хама = 30 _ 29 _ 32 _;
10. малады кандыдат у рыцары = 67 _ 68 _ 47 _;
11. прабыванне, лад жыцця = 63 _ 85 _ 87 _ 57 _ 84 _;
12. знешняе пачуццё для ўспрымання гукаў = 60 _ 61 _ 65 _ 66 _;
13. вертыкальная апора пабудовы = 24 _ 28 _ 26 _ 27 _ 23 _;
14. Хам Ною = 16 _ 14 _ 22 _;
15. напрамак дзейнасці, спецыялізацыі = 1 _ 15 _ 46 _ 64 _;
16. сын Ноя = 58 _ 59 _ 56 _;
17. вадзяны звярок атрада насякомаедных з каштоўным футрам, пражываючы, у прынцыпе, на ўсходзе Еўропы (*Desmana*) = 5 _ 4 _ 51 _ 50 _ 49 _ 83 _;
18. арганічнае рэчыва са знешняга покрыва членістаногіх (*chitinum*) = 53 _ 52 _ 19 _ 18 _ 17 _;
19. карыслівец = 9 _ 10 _ 8 _ 25 _ 62 _ 20 _;
20. верхняя частка галавы = 43 _ 86 _ 35 _ 34 _;
21. сплаў жалеза з вадародам больш крохкі за сталь = 77 _ 78 _ 75 _ 76 _ 3 _.

(ш)



Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 17 нумара

Цыбуля, Кутузаў, авёс, рагач, Рым, звычай, Рыбы, булава, дым, Ош, кітабой, ніць, ціс, тыдзень, ям, не, ітрый, соя, век, Галгофа, аят, якут, імя, крэпасць, сук, барытон, паліцай, Хапёр, цесць, Бялград, бунт, вольха, скіт.

Рашэнне: **Заўсёды трошкі таямніцай была ты для мяне і ёсць, чагосьці светлага крыніцай, перад якім я толькі госць.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лукашу Пацэвічу** і **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

29.05 — 04.06

(22.03. — 20.04.) Пра Барана (мо і пра цябе?), будуць гаварыць у інтэрнэце. Карысны ўплыў зорак на інтымнае жыццё. Рыхтуйся на вельмі вялікія сюрпрызы. Маеш шанц пазнаёміцца з нейкай асаблівай персонай, якая значна паўплывае на цябе. Будзеш ззяць красою. Лёгкая камунікацыя з іншымі. Маеш добрую аўру на аднаўленне.

(21.04. — 21.05.) Марс паўплывае на цябе пазітыўна. Здзяйсненне намераў можа быць крышку прыспешаным. У сераду пасля поўдня твой знак Задыяка будзе табе вельмі спрыяць. Ды схільнасць да рызыкі можа табе зашкодзіць.

(22.05. — 22.06.) Спантаннасць і гатоўнасць у найбліжэйшы час для цябе вельмі дарэчы. Твае дакладнасць і парадак будуць заўважаны ўжо на пачатку тыдня, што можа стаць крыніцай даўно спадзяваных паваротаў у тваім жыцці. У нядзелю пільнуйся ад злодзеяў, незнаёмы схоча цябе заваражыць, дык пасля акажацца, што паказныя эмоцыі неверагодныя.

(23.06. — 23.07.) Чакае цябе больш працы і падарожжаў. Дробныя праблемы са здароўем; не перанатужвайся. Еж многа морквы! Не пераборшчвай з алкаголем. Неўзабавае паявіцца ў табе воля перамен і будзе мець яна шанц на рэалізацыю. Чакаюць новыя знаёмствы. З чэрвеня пачнеш збіраць плёны.

(24.07. — 23.08.) Дасягнеш намечанай мэты, ды зрабі яе канкрэтнай; не дазволь, каб іншыя вырашалі за цябе. Чакае цябе праца над тым, каб зразумець, што гавораць іншыя; уключы эмоцыі. Дзякуючы падтрымцы найбліжэйшых не будзе спраў немагчымых для рэалізацыі. У чэрвені можаш спадзявацца вялікіх прыбыткаў.

(24.08. — 23.09.) Праўдападобна будзе крыху прычын для нерваў, ды ці трэба гэтым стрэсавацца? Старанлівасць і парадак асоб са знаку Дзевы ўрэшце будуць ацэнены пры канцы тыдня, што можа быць прычынай здаўна чаканых змен. Добры ўплыў Нептуна на твой настрой. У чэрвені будзь прытомны і не дай сябе ўвесці ў зман.

(24.09. — 23.10.) Несвядома будзеш весці бой з супрацьстаўнымі спакусамі, ды гэта не мае глыбейшага сэнсу. Шалі маюць звычай не дапускаць іншых да голасу. Таму ў аўторак шукай людзей, якім можаш памагчы, аддаючы ім час і слухаючы іх. Спакой душы і карысныя сувязі з сям'ёй і з суседзямі. У чэрвені на працы пойдзе ўсё па тваёй думцы.

(24.10. — 22.11.) Пятніца гэта найлепшая пара для індывідуальных паходаў, у час якіх можаш абдумаць свае справы. Праца над тым, каб услухацца ў тое, што скажуць іншыя; адкрыйся на пачуцці. Тыдзень спрыяе пошукам шчасця ды асцярожнай мадыфікацыі планаў. Самотны Скарпіён у чэрвені можа сустрэць каханне свайго жыцця! Работы ў чэрвені пад завязку, ды які вялікі плён пасля!

(23.11. — 22.12.) Слухай пільна таго, што скажуць іншыя, райся, ды аддалі ад сябе эмоцыі. Дзякуючы падтрымцы сяброў няма спраў немагчымых для рэалізацыі. Прыйшоў час, каб выявіць свае пачуцці. Блізкія бачаць цябе не такім, як ты спадзяваўся б. Кантралюй узбураныя эмоцыі.

(23.12. — 20.01.) Меншыя спадзяванні на паразу. Чакай прыліву кантактаў. Можаш трапіць на кагосьці, хто намяшае ў тваім спакоі. Не бойся ангажавацца. У канфліктах з партнёрам памятай, што няма ідэальных асоб. Пануй над эмоцыямі, бо можаш нарабіць сабе ворагаў. Не выдавай неабдумана грошай.

(21.01. — 19.02.) У пятніцу адпачывай, найлепш выберыся на прыроду. Дай шанц іншым, каб штосьці зрабілі і сказалі самі. Спадзявайся многа новых знаёмстваў. У чэрвені твае планы здзейсняцца, ды не пакідай за сабою хвастоў і не адставай. Канкурэнцыя пойдзе толькі ў карысць.

(20.02. — 21.03.) Хоць крыху часу прызначай на адпачынак. Планы будуць рэалізавацца ў спадзяваным часе. Зоркі маюць для цябе шмат свежых рэляцый, недзе каля панядзелка. Сустрэчы з асобамі з мінулага. У чэрвені рыхтуюцца для цябе пахвалы, павышэнне, новая крыніца заробку.

Агата АРЛЯНСКАЯ

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.

Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк, Янка Целушэцкі.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty.
Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju.
Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734
Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2011 roku — 52.
Przesyłka zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.
Przesyłka priorytetowa: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 7,20 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 300 egz.

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

ВЕЛІКОДНЫЯ астравы (2)

— *Хрыстос Васкрэсе*! — аб'яўляе тройчы на ўрачыстай ноце святар.

— *Воісцену Васкрэсе!* — грыміць у адказ народ.

За момант з абразамі і харугвамі, пад музыку званоў, абыдзем з хросным ходам асветлены будынак царквы. На гадзінніку поўнач. У левым крыле царквы, адкуль вынесуць ікону ў абкладзе, нервова тоўпяцца жанчыны. Той, хто паспее скарыстаць момант, паддасца абраду пераходу пад іконай. Праз некалькі хвілін кабеты перабіваюцца святым тунелем, зладжаным з Багародзічнай іконы, жаночых рук і цел. Дапамагае, як вераць, на жаночыя хваробы і праблемы звязаныя з мацярынствам. Ад намоленасці месца ад зямлі ў ногі ідзе ток. Царква ў Ласінцы стаіць на ўзгорку ля вытокаў ракі Ласініца. Кіламетр за вёскай сінее сцяна пушчы. Лес прысутны ў свабодалюбівай душы прыхаджан, тут не цалуюць святара ў руку.

Момант святочнага абнаўлення вяскоўцы перажываюць разам з прымяненнем колернай сімволікі. Перад поўначчу дзяўчына на хорах вяжа на голаў белую хустку. На двары чатыры градусы цяпла, пераход з цёплай сярэдзіны на халоднае паветра праганяе дакучлівы сон і стомленасць. У святле пражэктараў, якімі асветлена царква, бачу зноў генетычны воблік айчыны. Ён у фігурах і тварах людзей, у дзівосных свойскіх гутарках зразумелых адно мясцовым.

— Чаму тая баба надзела цёмную хустку? — пытаецца ўголас сябе самой Вольга настолькі гучна, каб навокал пачулі.

— Можа яна ў траўме? — кажу ў апраўданне цёткі ў чорным.

— Перастань! *Дзісь* няма ў нас жалобы і траўмы, — павучае мяне цётка Вольга.

* * *

Добра сказаць — няма траўмы і жалобы! Калі еду з візітам да маці ў сваю Кутлоўку, мімавольна адчуваю подых канчыны. Мясціна літаральна вымерла на маіх вачах. З трыццаці жылых дамоў, дванаццаць ужо без людзей. На іншых пяці панадворках прапалі забудовы. У сямі хатах пражываюць удовы. Цягам апошніх месяцаў памерлі дзве добрыя суседкі. Таму, калі я пабачыла адноўлены і абсаджаны чырвонымі цюльпанамі крыж у пачатку вёскі, я адразу спытала:

— Гэта тыя з Варшавы так гожа прыбралі наш крыж?

Пытанне падказвалі вопыт і памяць. Калі ў каго з мясцовых спытаць пра павалены плот ці загружаны ўсякім ламаччам панадворак, заўсёды тут адзін адказ:

— *Нэма часу!*

У апошні час эстэтычны выгляд мясціны паправіла працавітая сямейка са сталіцы. Варшавякі першыя ўвесь доўгі панадворак, ад вуліцы па клуню, абсадзілі морам разнаколерных кветак і асвятлілі яго лямпкамі. Прыгожы прыклад адразу трапіў пад стрэхі. Крыж ля ўвахода ўпрыгожыла мясцовая дзяўчына Агнешка Занкевіч, маці дваіх на ўсю вёску дзетак. З кожнай жывой хаты зрабілі складчыну па пяць злотых на адноўленне крыжа.

Калі я ступіла на свой панадворак, брат адразу павёў мяне паказаць новы прыбытак у гаспадарцы. Дакладней, пахваліцца новым дахам. Работу ў тры няцэлыя дні зрабіла фірма з Гайнаўкі.

— І як, можа быць? — спытаў ён з гонарам у голасе.

— *Ну, байкі!*

Праўда, больш чым новы дах са шведскай бляхі ўразіў падстрыжаны сад і нідэрландскія цюльпаны ў агародчыку мамы. Гэты ўпарадкаваны фрагмент прасторы, пасярод разваленых стадолаў і дзікіх садоў, прамаўляў як адчайнае змаганне з гібеллю. Пасярод брукаванай вуліцы, побач пакінутай сядзібы, выбіла крыніца. Вечарам у блізкім суседстве пачаў завываць хрыплым голасам сабака.

* * *

Да поўначы ўвесь прыцаркоўны ўзгорак у Ласінцы быў застаўлены машынамі. Між *таётамі* і *опелямі* выстойвалі дзве кампаніі маладзёнаў у пажарніцкай форме. Першыя трыццаць хвілін вартаўнікі Хрыстовай магілы будуць прыкоўваць да сябе ўвагу жаночага полу, каб апоўначы, у момант уваскрэсення, з эфектоўным грукатам ляснуць на зямлю і наклікаць атмасферу жаху. Гэты ганаровы грамадскі абавязак і традыцыя нясуць у сабе цікавую сацыялагічную карцінку. У ёй заўсёды можна было прачытаць моц парафіі. Памятаю, як у сярэдзіне васьмідзесятых гадоў у ганаровым саставе тырчэлі ўжо адны старыя кавалеры пасля двухтыднёвага запою. З іх з'ядліва кпілі дзяўчаты, дарэчы, як і належыць рымлянам за ўкрыжаванне Ісуса Хрыста. Аднак у нашым народзе *страж* заўсёды лічылі героямі, магчыма за тыя мундзіры. Сёлета ласінскія вартаўнікі божай магілы прыадзелі рабочы мундзір пажарніка з надпісам: STRAŻ. У першыя трыццаць хвілін яны арганізавалі змену варты з рапартам і эфектоўным маршам, ад якога дрыжэла падлога. Хоць афіцыйная каманда ішла на польскай мове, *рымская* страж з Ласінкі між сабой размаўляла, на мясцовым беларускім дыялекце. Пасля выкананага абавязку частка з іх пайшла спяваць на хоры.

Усяночную, якая доўжылася ў нас за чатыры гадзіны, я выстаяла ў кампаніі васьмідзесяцігадовых бабуль і сваякоў. Час ад часу бабулі рассцілалі хусткі і садзіліся адпачываць на падлогу, прыкрытую прыгожымі дыванамі і ходнікамі. Чатырохгадзінны час багаслужбы не для ўсіх па душы. Частка вернікаў, ужо пасля хрэснага ходу, раз'ехалася дамоў.

— *Подзівіліся і хваціт!* — пракаментавала пасля Вольга.

Калі а палове чацвёртай раніцы, ужо пасля багаслужбы, мы збіраліся дамоў, на аўтастаянцы паменшала ў пяць разоў машын. Часам у Ласінку прыязджаюць людзі з іншых парафій і Гайнаўкі, каб паслухаць цудоўныя хары дзяцей і дарослых. У гэты раз апрача спеваў мяне чакала неспадзеўка. Настаяцель прыхода а. Георгій Кос прывітаў мяне беларускім *Хрыстос Уваскрос!*

(працяг будзе)

Вернісаж Славаміра Рыбака

18 мая ў адным са «сподкаў» Ваяводскага асяродка анімацыі культуры, што па вуліцы Святога Роха ў Беластоку, адбыўся вернісаж выставы жывапісу Славаміра Рыбака. Выстава юбілейная — пяцідзесятая ў ягонай мастацкай біяграфіі, ды супала яна з трыццацігоддзем творчай працы мастака. Дарэчы — 31 мая спаўняецца Славаміру Рыбаку пяцьдзесят чатыры гады; нарадзіўся ён у Бельску-Падляшскім, але зараз пражывае ў Нурцы-Станцыі. Ужо першыя ягоныя працы, паказаныя ў Белавежы і ў бельскай ратушы, выклікалі цікавасць у знаўцаў мастацтва, якія належным чынам ацанілі ягоны талент і заахвоцілі да далейшай працы на мастацкай ніве. Спачатку пісаў ён партрэты, пазней нацюрморт, але галоўнай дзялянкай ягоных мастацкіх зацікаўленняў стаў пейзаж, а дакладней кажучы — наш мясцовы пейзаж Падляшша. Я шукаю таго, сказаў ён, што было створана Найдасканалым Мастаком. На выставе прэзентуюцца некалькі дзесяткаў краявідаў ягонага аўтарства. У маім успрыняцці гэтыя пейзажы надта рэалістычныя — на іх толькі прырода, не відаць людзей, бо ж зараз так яно і ёсць, што адбываецца абязлюдзенне нашай Усходняй сцяны. Лагічным дапаўненнем гэтага майго бачання мастацтва Славаміра Рыбака з'яўляецца адна з карцін ягонага сына Матэвуша — іх некалькі таксама дададзена да выстаўкі — дзе на фоне зарастаючай лесам і травастоем вясковай хаты паказана таблічка з надпісам «Sprzedam»...

На вернісаж выставы мастацтва Славаміра і Матэвуша Рыбакоў з'явілася — паводле маёй ацэнкі — каля двухсот асоб, што паказвае ранг мастака — маю на думцы спадара Славаміра — у асяроддзі беластоцкіх знаўцаў і любіцеляў жывапісу. Юбіляр атрымаў ад іх моц віншаванняў. Былі і віншаванні ад Культурнага цэнтра Беларусі ў Беластоку, а гэта невыпадкова. Славамір Рыбак быў запрошаны Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь для мастацкай дакументацыі прыроды беларускай часткі Белавежскай пушчы. Раней ён выканаў шэраг пейзажаў польскай часткі Пушчы. Ягоны талент быў высока ацэнены таксама і ў Польшчы, дзе на працягу трох гадоў ён сваімі мастацкімі сродкамі дакументаваў нацыянальныя паркі Польшчы.

Медыйны патранат над выставай прац Славаміра Рыбака ўзяло Радыё Рацыя ды беластоцкія аддзяленні польскіх публічных радыё і тэлебачання. Музычны фон для вернісажу стварыў не абы-хто, бо сам Віктар Шалкевіч, якога Славамір Рыбак кампліментаваў званнем найвыдатнага беларускага артыста. У сваю чаргу Віктар Шалкевіч сказаў, што карціны мастака прадстаўляюць абсалютную праўду, якая з кожным днём памірае. І некалькі разоў стаў запявалам публікі на «Многая лета» і «Sto lat» падляшскаму мастаку. А ў такім антуражы я нават не асмельваўся займаць час галоўнаму герою мерапрыемства, таму я адно дамовіўся з ім на асобную размову ў яшчэ неакрэсленай будучыні. Маю тады надзею, што ўдасца мне пазнаёміць ніўскую аўдыторыю больш дакладна з дэталямі творчай працы Славаміра Рыбака.

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

ISSN 0546-1960